

ДРУКАВАНАЕ СЛОВА ЦІ ІНТЭРНЭТ?

ЧЫРВОНКА

ГІСТОРЫЯ ВЫРАТАВАННЯ МЕДЗВЕДЗЯНЯЦІ



КАРАНІ І КРОНЫ


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 ЛІСТАПАДА 2021 г. ЧАЦВЕР № 228 (29597)


## КОРАТКА

- Першы энергаблок БелАЭС выпрацаваў 5 млрд кВт·гадз. электраэнергіі.
- **Сярэдні заробак у Беларусі ў кастрычніку склаў Br1478,9.**
- Першым установам аховы здароўя ўручаны пасведчанні аб медакрэдытацыі.
- **У Беларусі пройдзе рэспубліканскі конкурс харэаграфічнага мастацтва «Час танцаваць».**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення даследаванняў і стратэгічнага развіцця Нацыянальнага банка:**

*«Абапіраючыся на найлепшы сусветны вопыт, мы лічым: каб стабілізаваць інфляцыю і забяспечыць базавыя фундаментальныя ўмовы для павышэння патэнцыялу росту эканомікі, нам неабходна як мага хутчэй стварыць усе неабходныя ўмовы і ажыццявіць пераход да рэжыму таргетавання інфляцыі. Такі рэжым дапаможа знізіць інфляцыю, стабілізаваць інфляцыйныя чаканні, павысіць давер да беларускага рубля. Частка неабходных умоў ужо створана. Забяспечана заканадаўчае замацаванне цанавой стабільнасці ў якасці асноўнай мэты дзейнасці Нацбанка, палепшаны механізм кіравання ліквіднасцю банкаўскай сістэмы. Ажыццёўлены пераход на плаваючы рэжым абменнага курса. Удасканалена камунікацыйная палітыка Нацбанка. Таксама за апошнія гады прыняты шэраг значных мер па дэвалютызацыі эканомікі».*

# Яны сталі Небам... і — Героямі

**Лётчыкам Андрэю Нічыпорчыку і Мікіце Куканенку пасмяротна прысвоілі званне «Герой Беларусі»**





**Адпаведны ўказ учора падпісаў кіраўнік дзяржавы. Гэта найвышэйшая ўзнагарода, якая існуе ў нашай краіне, прысвойваецца за выключныя заслугі перад дзяржавай і грамадствам. Сярод удастоеных разам з гэтымі адважнымі ваеннаслужачымі — усяго 13 чалавек.**

На жаль, гэтыя маладыя, поўныя сіл і прагі да жыцця хлопцы атрымалі такую высоку ўзнагароду пасмяротна. Гэта быў подзвіг. Подзвіг у мірны час. У той майскі сонечны дзень нічога, як той казаў, не прадвяшчала бяды. Звычайныя вучэбна-трэніровачныя палёты. Як раптам самалёт Як-130, у якім знаходзіліся камандзір звяна вучэбнабаявой эскадрыллі 116-й гвардзейскай штурмавой авіяцыйнай базы маёр Андрэй Нічыпорчык і лётчык звяна лейтэнант Мікіта Куканенка, пачаў страчваць вышыню. Пілоты, як потым пакажа расшыфроўка бартавых самапісцаў, выразна ўсведамлялі: падзенне не пазбегнуць. І ў долі секунды прынялі рашэнне не пакідаць самалёт, бо пад ім — горад.

СТАР. 2

Эканоміка

## НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ПАНДЭМІЮ І САНКЦЫЙНЫ ЦІСК

**Як негатыўныя фактары адбіваюцца на занятасці? Што адбываецца з цэнамі ў крамах і аптэках? Ці вырасце «мінімалка»?**

**Адказы на гэтыя пытанні прагучалі падчас пасяджэння Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, які днямі прайшоў у сталіцы. Адной з цэнтральных тэм абмеркавання ўдзельнікамі стала выкананне Генеральнага пагаднення за 2019—2021 гады.**

### ЗАРОБКІ БЮДЖЭТНІКАЎ ВЫРАСЛІ

Нагадаем, што ў дакуменце прапісаны абавязацельствы трох бакоў сацыяльнага партнёрства — урада, наймальнікаў і прафсаюзаў — па дасягненні канкрэтных паказчыкаў узроўню развіцця эканомікі і гарантыі для працоўных. Асаблівая ўвага — пытанням узроўню аплаты працы. Важны момант, на які звярнулі ўвагу ўдзельнікі: абавязацельствы па росце заробкаў выконваюцца.

Так, забяспечаны прырост валавога ўнутранага прадукту нават звыш запланаваных лічбаў. У сваю чаргу, гэта дало магчымасць выканаць абавязацельствы па росце заробкаў работнікаў. У прыватнасці, намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў арганізацый краіны ў студзені — верасні бягучага года склала 1 399,7 рубля.

СТАР. 4



# Адна цыгарэта — загубленае жыццё

Спецыяльны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

**За 10 месяцаў гэтага года з-за неасцярожнага абыходжання з агнём падчас курэння ў краіне загінула больш як 300 чалавек**




**Непатушаныя цыгарэты па-ранейшаму лідзіруюць у рэйтынгу прычын пажараў. Бяспечнасць дарослых часта заканчваецца трагедыяй не толькі для саміх, а і для іх блізкіх, сяброў, знаёмых...**

### Адных выратавалі, іншым не пашанцавала

У пачатку месяца ноччу амаль у цэнтры Мінска гарэла кватэра ў шматпавярховіку. Ратавальнікі, якія ў лічаныя хвіліны прыбылі на пажар, устанавілі: у жылым пакоі на другім паверсе адбылося ўзгаранне пасцельных прылад і маёмасці. На канапе быў выяўлены труп гаспадыні кватэры, у суседнім пакоі на падлозе без прытомнасці ляжаў яе брат. Аднак медыкі, якія правялі рэанімацыйныя мерапрыемствы, вярнуць мужчыну да жыцця былі ўжо не ў сілах. Адна з версій прычыны пажару, які загубіў два жыцці, — неасцярожнае абыходжанне з агнём падчас курэння адным з загінулых.

СТАР. 5


**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы**





ISSN 1990 — 763X

Грамадская думка

# ВЯЛІКАЕ САЦДАСЛЕДАВАННЕ НАПЯРЭДАДНІ РЭФЕРЭНДУМУ

## У ІМ ВОЗЬМЕ ЎДЗЕЛ КАЛЯ 10 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК

**Пра гэта ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» расказалі беларускія сацыёлагі. «Сучасныя рэаліі сведчаць аб тым, што такія веды запатрабаваныя на самых розных узроўнях жыцця сучаснага грамадства. Мае калегі з Інстытута сацыялогіі праводзяць многія даследаванні. З ліку апошніх актуальных — прысвечаныя такой па-ранейшаму вельмі вострай праблеме, як COVID: стаўленне насельніцтва, пачуццё бяспекі ў існуючай сітуацыі і шэраг іншых спадарожных аспектаў. Мы вывучаем і такі феномен, важны ў кантэксце сучаснага сацыяльнага развіцця, як патрыятызм, гістарычная памяць, стаўленне да мінулага. У цэнтры ўвагі і пытанні, якія датычацца штодзённасці, задаволенасці рознымі ўмовамі свайго жыцця», — расказаў дырэктар Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт Мікалай МЫСЛІВЕЦ.**

Кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт БДЭУ Ірына Лашук нагадала аб нядаўнім апытанні, праведзеным Цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ па мабільнай сувязі. «Я скажу адразу, што гэта выклікала пэўны скептыцызм. Мабільныя тэлефоны, людзі знаходзяцца ў машыне, недзе яшчэ, ім нязручна размаўляць, а мы ім задаём такія сур'ёзныя пытанні. Але было вельмі важна паспрабаваць, сапраўды зачапіць людзей. У нас было апытана адна тысяча чалавек па ўсёй краіне. Першае пытанне, якое задавалі: як вы ставіцеся да правядзення ў краіне рэферэндуму па змяненні дзеючай Канстытуцыі? Па выніках: падтрымліваюць — 43,8 працэнта, хутчэй падтрымліваюць — 18,3 працэнта. Калі мы складзём гэтыя пазіцыі — атрымліваецца больш за 60 працэнтаў. Аднак трэба адзначыць, што 17,6 працэнта не змаглі адказаць, — сказала Ірына Лашук. — Другое пытанне: ці патрэбныя, на ваш погляд, змяненні ў дзеючую Канстытуцыю? Тут прыкладна такі расклад маем: так — 32,7 працэнта, хутчэй так — 30,4 працэнта. А 17 працэнтаў рэспандэнтаў яшчэ не прынялі для сябе рашэння, што яны наконт гэтага думаюць. Трэцяе вельмі важнае пытанне: ці плануеце вы ўзяць удзел у рэферэндуме па змяненні дзеючай Канстытуцыі? 38 працэнтаў — дакладна пойдуць, хутчэй так — 21,6 працэнта. Чацвёртае пытанне: як паўплывае на сітуацыю ў краіне правядзенне рэферэндуму па ўнясенні змяненняў у Канстытуцыю? Адбудуцца значныя станоўчыя змены — 23,9 працэнта, адбудуцца нязначныя паляпшэнні — 26,3 працэнта. І ўявіце сабе, што 18 працэнтаў у нас зноў не змаглі адказаць».

Цяпер у Беларусі праводзіцца вялікае сацдаследаванне напярэдадні рэферэндуму. «Вельмі вялікая выбарачная сукупнасць сфарміравана — каля 10 тысяч рэспандэнтаў. Як правіла, сацыёлагі ў сваіх даследаваннях звяртаюцца да меншых выбарак, але ў гэтым выпадку абраны намі падыход абумоўлены яшчэ і тым фактам, што праз людзей, якія ўдзельнічаюць у такім апытанні, ёсць магчымасць данесці да як мага больш шырокага кола тую змястоўную прастору, якая цікавіць і сацыёлагаў, і ўсё грамадства, — растлумачыў Мікалай Мыслівец. — У ліку пытанняў, якія прапануюцца нашым рэспандэнтам, — ацэнка іх уласнага сацыяльна-эканамічнага становішча, дынаміка гэтага становішча, пытанні, якія датычацца нашых узаемаадносін з суседзямі: Расіяй і іншымі дзяржавамі. У цэлым бланк інтэрв'ю складаецца з 24 пытанняў, самы вялікі блок — чаканні ад змяненняў, якія мы плануем убачыць у Канстытуцыі».

Пасля правядзення такога вялікага даследавання Інстытутам сацыялогіі запланаваны і ўласныя даследаванні ў рамках такой жа праблематыкі. «Таму што свет змяняецца, сітуацыю неабходна адсочваць у дынаміцы, чаму сацыялогія і служыць. Усе даследаванні цяпер прадугледжваюць выкарыстанне комплексных метадаў. Дзесяцітысячнае апытанне, пра якое мы гаворым, праводзіцца метадам face-to-face, гэта значыць твар у твар. Мы выкарыстоўваем у сваёй практыцы апытанне абанентаў гарадской тэлефоннай сеткі, гарантуючы рэпрэзентатыўнасць кола рэспандэнтаў, якія ўдзельнічаюць у апытанні, — дадаў дырэктар інстытута. — Не магу цяпер сказаць, калі наша даследаванне завершыцца. Як мінімум яно будзе прадаўжацца яшчэ на працягу некалькіх тыдняў. Акрамя ўласна апытальнай часткі, патрэбна інфармацыю ўводзіць, апрацоўваць — усё гэта таксама даволі працаёмкія працэсы».

**Паводле БелТА.**

Інтэграцыя

# «Саюзны медыяхолдынг мы будзем ствараць на самых сучасных практыках лічбавага развіцця»

**Пра гэта заявіў на экспертна-медыйным форуме «Саюзная дзяржава: інфармацыйная прастора ў лічбавую эпоху» дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў. Мерапрыемства, арганізаванае Пастаянным камітэтам СД і Міжнародным інфармацыйным агенцтвам «Расія сёння», праходзіла на гэтым тыдні ў Маскве.**

Дзмітрый Мезенцаў расказаў, што стварэнне саюзнага медыяхолдынга, пра які гаварылі на Вышэйшым дзяржсавеце Беларусі і Расіі, з ідэі перайшло ў статус даручэння Пастаяннаму камітэту.

«Мы самым уважлівым чынам паставімся да прапаноў бакоў, прафесійнай супольнасці, саюзаў журналістаў, людзей, якія гэтыя гады фарміравалі адзіны медыйны парадак дня. Медыяхолдынг мы будзем будаваць на самых сучасных практыках лічбавага развіцця, не забываючы пры гэтым, што дружба, эмоцыі, таварышаванне не падмяняюцца ніякімі лічбавымі практыкамі», — сказаў дзяржсакратар.

Работа па стварэнні мадэлі саюзнага медыяхолдынга, паводле яго слоў, пачнецца ў найбліжэйшыя дні.

Журналісты таксама пацікавіліся ў дзяржсакратара, ці магчыма, што беларускія рэпарцёры ў Расіі, а расійскія ў Беларусі ў хуткім часе пазбавяцца статусу прадстаўнікоў замежных СМІ.

«Калі пашпарт у беларуса і расіяніна розны, то набор сацыяльных правоў абсалютна аднолькавы. І гэта прымушае нас прыйсці як мага хутчэй да таго, каб расійскія і беларускія журналісты былі журналістамі Саюзнай дзяржавы і не мелі бюракратычных перашкод, на якія яны абавязаныя ісці, дамагаючыся акрэдытацыі ў нашых краінах у рамках фармальнай розніцы ў заканадаўстве», — дадаў Дзмітрый Мезенцаў.

**Марыя ДАДАЛКА,**
*Масква.*

# Яны сталі Небам... і — Героямі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Праявіўшы выключную мужнасць і гераізм, лётчыкі імкнуліся адвесці самалёт ад Баранавіч. Пераканаўшыся, што траекторыя падзення знаходзіцца па-за жылымі дамамі, катапультаваліся. Аднак было вельмі позна... Як пасля паведамілі ў Следчым камітэце, прычына трагедыі — адмова сістэмы кіравання самалётам.

У воінскай часці, дзе служылі афіцэры, з вялікай радасцю і хваляваннем успрынялі навіну аб высокай узнагародзе сваіх баявых таварышаў. Хоць, як прызнаюцца вайскоўцы з Ліды, для іх гэтае рашэнне было чаканым.

— Мы ні на секунду не сумняваліся ў правільнасці прыняцця рашэння нашымі хлопцамі і ў той жа час з разуменнем адносіліся да таго, колькі часу спатрэбілася для разгляду ўсіх аспектаў, якія склаліся на той момант, калі адбылася катастрофа, — расказаў «Звяздзе» **намеснік камандзіра 116-й гвардзейскай штурмавой авіяцыйнай базы па ідэалагічнай рабоце, гвардыі падпалкоўнік Эдуард ЖМАКІН**. — Рашэнне, прынятае Галоўнакамандуючым, Прэзідэнтам краіны Аляксандрам Лукашэнкам, не паддаецца ніякаму сумненню, і іншага мы як ваеннаслужачыя Узброеных Сіл не чакалі. Для нас гэта найвышэйшы гонар.

Нягледзячы на тое, што з моманту трагедыі ўжо прайшло больш чым паўгода, саслужыўцы яшчэ канчаткова не змірыліся з тым, што Андрэя Нічыпорчыка і Мікіты Куканенкі з імі няма. «Іх нам ніхто не заменіць, — пераканаlittlechany Эдуард Жмакін. — Прыходзячы на службу, мы часта згадваем хлопцаў. Гэтыя ўспаміны прыходзяць, і калі ляціш у самалёце, і калі глядзіш на парты, за якімі яны сядзелі. Прайшло яшчэ вельмі мала часу, каб нешта сцерлася з памяці. І ці ўвогуле гэта магчыма?!»

Воінская часць, дзе служылі лётчыкі, плануе хадайнічаць аб тым, каб загінулых пілотаў навечна залічылі ў спісы вучэбна-баявой авіяцыйнай эскадрыллі. У пакоі баявой славы неўзабаве будзе створана месца, прысвечанае героям. А 9-я школа горада Ліды, дзе вучыўся Андрэй Нічыпорчык, атрымае яго імя. На дамах, дзе ў Лідзе жылі маладыя людзі, з'явяцца памятныя дошкі. Ужо паднята пытанне і аб тым, каб назваць імёнамі авіятараў лідскія вуліцы. Такое рашэнне ўжо прынята ў Баранавічах, дзе загінулі лётчыкі. На месцы падзення самалёта з'явіцца памятны знак экіпажу, які паляцеў у вечнасць.

**Вераніка КАНЮТА.**


**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества**

**ОАО «Трест Белстромремонт»**

| № Лота | Наименование предмета торгов и его местонахождение | Начальная стоимость без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 600/D-94120, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Зеленая, 1В-111, площадь – 40,8 кв. м | 60 600,00 | 3 030,00 | 3 030,00 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся третьи повторные торги. Стоимость снижена на 40 %. Публикация о проведении торгов ранее размещалась в газете «Звязда» № 74 (29443) от 21.04.2021, стр. 2; № 99 (29468) от 28.05.2021, стр. 6, № 108 (29477) от 10.06.2021, стр. 14

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения открытого аукциона** | **7 декабря 2021 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, офис 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **с 10.00 25 ноября 2021 года до 16.00 3 декабря 2021 года** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, офис 1127 |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000,** код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по продаже имущества ОАО «Трест Белстромремонт», назначенных на 07.12.2021, по Лоту № 1.
2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 14 (четырнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) рабочих дней. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.
6. Контактное лицо для ознакомления с имуществом: тел. **+375 29 304 25 60, Андрей.**
7. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
8. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
9. Государственная регистрация договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества, возлагаются на Победителя аукциона

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Открытое акционерное общество «Трест Белстромремонт» (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», +375 29 304 59 90)** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Фрондера», 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Прудники-Агро» (продавец) проводит открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ ОДНОЭТАЖНОГО БЛОЧНОГО ЖИЛОГО ДОМА**

***(составные части и принадлежности: пристройка, сарай)***
**с инв. № 633/С-8833 общей площадью 58,3 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624055700001000460 площадью 0,1316 га** ***(право постоянного пользования)*** **по адресу: Минская область, Мядельский район, г. п. Кривичи, ул. Луговая, д. 9.**

*Объект находится в залоге у ОАО «Белагропромбанк» по договору об ипотеке.*

Начальная цена объекта без НДС (20 %) **– 29 446,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены **(2 944,00 бел. руб.).**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **28.12.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.12.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра (8029) 948-77-19.**

УНН 600057704

Кантэкст

# СЛЁЗАТАЧЫВЫ ГАЗ І АЎТАМАТНЫЯ ЧЭРГІ

ПОЛЬСКІЯ СІЛАВІКІ АДЧУВАЮЦЬ БЕСПАКАРАНАСЦЬ

**Беларусы аказваюць дапамогу бежанцам, але важна вырашыць саму праблему. Аб гэтым заявіў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, каменціруючы сітуацыю на беларуска-польскай граніцы, перадае БелТА. Ён адзначыў, што зараз у Цэнтральнай частцы Еўропы адбываецца такое напружанне, «калі людзі цярпяць вялікі смутак, цяжкасці, а некаторыя нават гінуць». «Вельмі важна, каб менавіта тыя, хто можа ўплываць на гэту сітуацыю, пайшлі насустрач гэтым бедным людзям і вырашылі яе. Тым больш што набліжаецца Раство Хрыстова», — заўважыў мітрапаліт Веніямін.**

## НА МЕСЦЫ ЗДАРЭННЯ

Тым часам Следчы камітэт праводзіць праверку па факце чарговага прымянення спецсродкаў з боку Польшчы ў адносінах да бежанцаў. Аб гэтым паведаміў **афіцыйны прадстаўнік УСК па Брэсцкай вобласці Раман ЗАРМАЕЎ**.

«Следствам устаноўлена, што ноччу 23 лістапада на адным з участкаў пагранічнай заставы «Такары» Камянецкага раёна група замежных мігрантаў знаходзілася каля польскай загароды. Пры гэтым людзі прасілі прыстанішча ў Польшчы, ніякай агрэсіі не праяўлялі. У адказ на гэта польскія сілавікі прымянілі ў адносінах да бяззбройных мігрантаў слёзатачывы газ, выбухпакеты, якія закідвалі на тэрыторыю Беларусі», — расказвалі ў СК.

На месца здарэння выбыла следча-апаратыўная група. Падчас агляду месца здарэння зафіксавана следавая карціна, якая сведчыць аб прымяненні спецыяльных сродкаў у адносінах да мірных бежанцаў. Узяты шматлікія фрагменты боепрыпасаў. Па ўсіх узятых падчас агляду месца здарэння аб'ектах назначаны ўзрывазтэхнічныя экспертызы, апытаны відавочцы здарэння. Папярэдне ўстаноўлена, што па медыцынскую дапамогу ў выніку інцыдэнту на граніцы ніхто не звяртаўся. Па гэтым факце Камянецкім РАСК праводзіцца праверка.

### Тым часам

#### У ЗОНЕ ЎДАРУ

ЗША разгарнулі на граніцы Польшчы з Беларуссю не менш як 30 самаходных артылерыйскіх установак Paladin, паведаміла інфармацыйнае агенцтва Avia.pro. Паводле даных агенцтва, пасля перакідкі некалькіх дзясяткаў танкаў, браніраваных аўтамабіляў і некалькіх тысяч ваеннаслужачых НАТА на граніцу з Беларуссю стала вядома, што ЗША дадаткова перакінулі да польска-беларускай граніцы не менш за 30 самаходных артылерыйскіх установак M109A7 Paladin калібру 155 мм. Узбраенне было дастаўлена некалькімі чыгуначнымі саставамі з тэрыторыі Германіі. Пры гэтым з улікам далёкасці САУ M109A7 Paladin тэрыторыя Беларусі знаходзіцца ў зоне ўдару амерыканскіх ваенных. Амерыканскі бок пакуль не каментуе перакідку свайго ўзбраення і ваеннай тэхнікі да граніц Беларусі.

## НАЗІРАЛІ ЗА ПАКУТАМІ І... ПАСМІХАЛІСЯ

А сітуацыя на беларуска-польскай граніцы застаецца напружаная. І зноў з'яўляюцца паведамленні аб зверствах польскіх сілавікоў, якія насамрэч страцілі чалавечае аблічча. Яны прадаўжаюць труціць бежанцаў газам, паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце. «23 лістапада двое іншаземцаў падышлі да польскіх загарод, каб папрасіць аб магчымасці падаць прашэнне атрымаць статус бежанца. Ніякіх агрэсіўных дзеянняў мужчыны не рабілі. Нягледзячы на мірныя звароты бежанцаў, польская ваеннаслужачыя проста распылілі пярцовы газ, — расказалі ў ДПК. — Адзін з іншаземцаў, які пацярпеў пасля прымянення спецсродкаў, паспрабаваў звярнуцца па меддапамогу. У адказ польскія ваеннаслужачыя, якія назіралі за пакутамі іншаземца, проста пасміхаліся. Другі ж бежанец, здымаючы відэа, каментаваў усё, што адбываецца, неадназначна заклікаючы польскіх сілавікоў спыніць здзекі. А калі польскім праваахоўнікам надакучыла слухаць просьбы аб дапамозе, яны цынічна залілі чалавека, які меў патрэбу ў абароне, яшчэ раз пярцовым газам са словамі «ідзіце прэч».

Іншы выпадак адбыўся ўжо ноччу, калі група адчайных бежанцаў прыняла рашэнне самастойна прайсці на тэрыторыю Польшчы. На гэты крок людзей падштурхнула бязвыхадное становішча, у якім яны апынуліся з-за адсутнасці легальнай магчымасці падаць прашэнне аб атрыманні аховы ў ЕС. «На гэты раз польскія сілавікі сустрэлі бежанцаў аўтаматнымі чэргамі. Для спынення магчымых правакацый гэты ўчастак быў прыкрыты беларускімі ваеннаслужачымі», — дадалі ў ведамстве.

## ВАЕННЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ

Польскія ўлады здзяйсняюць ваенныя злачынствы. Такую думку ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» выказаў **латвійскі паліталаг Эйнарс ГРАЎДЗІНЬШ**, каментуючы сітуацыю на беларуска-польскай граніцы. «Існуе шэраг канвенцый, у першую чаргу Гаагская, Жэнеўская канвенцыі, дзе дакладна прапісаны правілы прымянення ваеннай сілы, права дэманстраваць сілу і гэтак далей. І як чалавек, які мае вышэйшую ваенную адукацыю, як былы афіцэр, я магу сказаць, што, на жаль, гэтыя канвенцыі не выконваюцца. Калі зыходзіць з пазіцый міжнароднага права, то польскія ўлады ўчыняюць ваенныя злачынствы з усімі вынікамі. Чаму польскія славыя структуры выкарыстоўваюць вадамёты, прымяняюць хімічныя сродкі — пытанне аб мэтазгоднасці і законнасці», — сказаў Эйнарс Граўдзіньш. Паводле яго слоў, Польшча павінна даць бежанцам гуманітарны калідор. «Згодна з міжнародным правам, бежанцы з зон баявых дзеянняў павінны беспрашкодна прымацца ў краінах, дзе яны просяць прытулак», — падкрэсліў паліталаг.

ЕС і Польшча ў адносінах да бежанцаў дэманструюць жорсткасць, бяздушнасць і двайныя стандарты. Аб гэтым заявіў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» **генеральны дырэктар міжнароднага інфармацыйнага агенцтва «Россия сегодня» Дзмітрый КІСЯЛЁЎ**. «Таму што самі ў рэшце рэшт вуснамі Меркель запрасілі бежанцаў да сябе, сказаўшы, што мы справімся, мы моцныя. А цяпер мы бачым, што занялі кругавую абарону, пабудавалі масавую сцяну з калючага дроту на тэрыторыі Еўропы, на тэрыторыі Шэнгенскай зоны, адгарадзіўшыся адзін ад аднаго», — сказаў Дзмітрый Кісялёў. Паводле яго слоў, Беларусь у гэтых умовах праявіла найвышэйшыя гуманітарныя стандарты. «Беларусь людзей пасяліла, поіць, корміць, саграває. А Польшча палівала ядавітымі сумесямі на марозе. Мы ўсё гэта бачылі, гэта бачыў увесь свет, — адзначыў Дзмітрый Кісялёў. — Беларусь не бамбіла Ірак і Сірыю. Таму крызіс з мільённымі бежанцамі не быў учынены Беларуссю. Яе адкрытая прававая пазіцыя была выкарыстана, на жаль, супраць яе».

## СМЯРОТНЫЯ ГРАНІЦЫ

Граніцы ЕС — самыя смяротныя ў свеце. Прынамсі 22 853 чалавекі загінулі ў Міжземным моры з 2014 года, спрабуючы дабрацца да берагоў ЕС. У апошнія месяцы мы назіраем за пакутамі бежанцаў, якія спрабуюць трапіць у ЕС праз польскую граніцу. Аб гэтым заявіў **генеральны дырэктар міжнароднай арганізацыі Oxfam Ireland, член выканаўчага савета Агенцтва ЕС у асноўных правах (FRA) Джым КЛАРКЕН**, паведаміла выданне The Journal.

«Палітыка ЕС у галіне міграцыі і атрымання прыстанішча, якая прыводзіць да такіх гуманітарных пакут, і рэакцыя ЕС на трагедыю дэманструюць, што Еўрасаюз павінен змяніць падыход да міграцыі і міжнароднай абароны. Невыкананне гэтага патрабавання можа прывесці да паўтарэння трагічных падзей і ў канчатковым выніку да падрыву Канвенцыі ААН аб статусе бежанцаў 1951 года», — лічыць Джым Кларкен.

Мігранты і бежанцы, якія пакідаюць Сірыю, Ірак і іншыя ахопленыя вайной краіны, праводзяць халодныя дні і ночы на граніцы ЕС з Беларуссю. «Яны спадзяваліся трапіць у Еўрасаюз, які аб'явіў сябе абаронцам правоў чалавека. Замест гэтага польскія ўлады прымянілі супраць гэтых людзей слёзатачывы газ і вадамёты і адмовілі НДА ў доступе з гуманітарнай дапамогай. Гэта відавочнае парушэнне гуманітарных прынцыпаў», — гаворыць кіраўнік Oxfam Ireland.

«ЕС выдзеліў гуманітарнае фінансаванне для падтрымкі тых, хто заблакіраваны на граніцы Беларусь — ЕС, але яго асноўны падыход быў у тым, каб ухіляцца ад адказнасці за бежанцаў і мігрантаў на сваіх граніцах», — адзначае Джым Кларкен. «ЕС з'яўляецца адным з найбагацейшых рэгіёнаў свету, і пры наяўнасці палітычнай волі 27 дзяржаў-членаў могуць прыняць адносна невялікую колькасць бежанцаў, якія прыбываюць да граніц ЕС, замест таго каб перакладваць адказнасць на «краіны-партнёры», — лічыць кіраўнік Oxfam Ireland. Ён заўважыў, што «ўсе дзяржавы — члены ЕС павінны дамовіцца аб справядлівых умовах падзелу адказнасці, абароне асоб, якія шукаюць прыстанішча, і размяшчэнні іх у дастойных умовах. У адваротным выпадку трагічныя смерці на граніцах ЕС будуць працягвацца».

**Пётр ДУНЬКО.**

З граніцы

# НОВЫЯ ЛАКАЦЫІ — ЛАЗНЯ І ПРЭС-ЦЭНТР

**Амаль два тыдні бежанцы жывуць у транспартна-лагістычным цэнтры каля КПП «Брузгі» на беларуска-польскай граніцы. Палявая лазня значна ўзняла іх настрой. Многія літаральна беглі да палатак, каб хутчэй памыцца, змяніць бялізну. Прадстаўнікамі галоўнага ўпраўлення аховы здароўя вобласці для гэтых мэт прывезены сродкі гігіены і плёнкі. Першымі водныя працэдуры прынялі жанчыны з дзецьмі. Пасля наведвання лазні ўсе ахвотныя змаглі выбраць сабе чыстае адзенне з гуманітарнага грузу. Мяркуецца, што палявая лазня будзе працаваць да той пары, пакуль яе не наведаюць усе жадаючыя з лагера бежанцаў.**

У лагістычны цэнтр пастаянна прыбываюць машыны з гуманітарным грузам. Ужо 20-ы мікрааўтобус прыехаў ад Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Чарговая партыя — фруктовыя пюрэ, зефір, пячэнне, сок. Па словах **сенатара Віктара ЛІСКОВІЧА**, аднаго з каардынатараў гуманітарнай дапамогі і медыцынскага абслугоўвання, сюды прывезена больш за 70 тон гуманітарнага грузу. Медыцынскую дапамогу аказваюць дзве брыгады медыкаў. Да іх за апошнія суткі звярнулася больш як 130 чалавек, шасцёра бежанцаў праходзяць лячэнне ў стацыянарах Гродна. Адзначана, што за час знаходжання ў лагістычным цэнтры не было лятальных выпадкаў. У найбліжэйшыя дні пачнецца абследаванне людзей на сухоты.

Гарачае харчаванне бежанцы атрымліваюць раніцай і ў абед. Выдаецца сухі паёк на вячэру. Пастаянна працуе палявая кухня, дзе можна атрымаць гарачую ваду, развесці малочныя сумесі ці падагрэць ежу для дзяцей. Для малых паступае гуманітарны груз з цацкамі, альбомамі для малявання, каляровымі крэйдамі. Дзеці пастаянна атрымліваюць цукеркі, якія вельмі любяць.

Каб забяспечыць бежанцаў патрэбнымі рэчамі, ім прапанавалі запоўніць спецыяльныя анкеты. Гэтым займаецца Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа. Анкеты складзеныя на трох мовах, у тым ліку на арабскай і англійскай. Частка іх ужо запоўнена. Яны будуць аналізавацца, і, па меры магчымасці, запыты людзей будуць задавальняцца.

Прадуманы меры пажарнай бяспекі. **Начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Дзмітрый ЛАКІЗА** паведаміў, што на аб'екце пастаянна працуе нарад ратавальнікаў, некалькі супрацоўнікаў ажыццяўляюць агляд лагера і тэрыторыі. Тут ёсць дадатковыя выхады на грузавыя рампы, гэта шырокія праёмы, пры неабходнасці яны будуць адкрытыя. Абсталявана сістэма апавяшчэння пры пажары. У прафілактычных мэтах уключаецца гукавое паведамленне.

Сітуацыя на беларуска-польскай граніцы паранейшаму застаецца ў полі зроку як беларускіх, так і замежных СМІ. Як заўважыў **першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Андрэй КУНЦЭВІЧ**, Міністэрства замежных спраў нашай краіны ўжо выдала каля 90 акрэдытацый журналістам 36 замежных медыярэсурсаў. Акрамя таго, яшчэ каля 40 замежных журналістаў мае пастаянную акрэдытацыю на тэрыторыі Беларусі. Для большай зручнасці работы СМІ на базе перасоўнага аўтамабільнага комплексу пачаў працаваць мабільны прэс-цэнтр. Супрацоўнікі прэс-цэнтра будуць акумуляваць звесткі і дзяліцца з журналістамі найбольш актуальнай інфармацыяй аб мерапрыемствах, якія тут ладзяцца, магчымых візітах, а таксама рыхтаваць прэс-брыфінгі і прэс-канферэнцыі. Для работнікаў прэсы абсталявана 8 рабочых месцаў з доступам у інтэрнэт, пры неабходнасці колькасць такіх месцаў будзе павялічвацца. Сам прэс-цэнтр працуе штодзень з 9 да 18 гадзін.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Швецыі ўпершыню ў гісторыі абралі прэм'ера-жанчыну



Рыксдаг (шведскі аднапалатны парламент) прагаласаваў за прызначэнне лідара Сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі Швецыі Магдалены Андэрсан прэм'ер-міністрам. Яна стала першай жанчынай у гісторыі краіны, якая заняла гэтую пасаду. У 2014 годзе Андэрсан заняла пасаду міністра фінансаў Швецыі, стаўшы першай жанчынай на дадзенай пасадзе ва ўрадзе. Сёлета ў пачатку лістапада ў адстаўку з пасады прэм'ера-міністра Швецыі сышоў Стэфан Лёвен. Ён узначаліў Сацыял-дэмакратычную партыю Швецыі ў 2012 годзе і прывёў яе да перамогі на двух выбарах — у 2014-м і 2018 гадах. Аднак апошнім часам пазіцыі партыі пахіснуліся.

## Колькасць памерлых ад каранавіруса ў Еўропе можа перавысіць 2 мільёны

У рэгіянальным бюро СААЗ заявілі, што пры захаванні цяперашніх тэндэнцый колькасць памерлых ад наступстваў каранавіруса ў Еўропе можа перавысіць 2 млн да сакавіка 2022 года, паведаміў Euronews. «Напярэдадні нас чакае няпростая зіма, але мы не павінны губляць надзею, таму што ўсе мы — урады, органы аховы здароўя, кожны з нас — у стане прыняць рашучыя меры для стабілізацыі эпідэмічнай сітуацыі», — напісаў у Twitter дырэктар еўрапейскага бюро СААЗ Ханс Клюге. СААЗ заклікае больш актыўна прывіваць і рэвакцынаваць насельніцтва. Людзям рэкамендуецца не забываць пра прафілактычныя меры.

## У Германіі імкліва пагаршаецца сітуацыя ў многіх галінах эканомікі

Прэзідэнт Гандлёва-прамысловай палаты Германіі (DIHK) Петэр Адрыян папярэдзіў аб імклівым пагаршэнні сітуацыі ў многіх галінах эканомікі ФРГ. Такая сітуацыя абумоўлена рэзкім павелічэннем узроўню захваральнасці на COVID-19, паведаміла ТАСС. «Рост фондавых рынкаў не павінен утойваць той факт, што большая частка эканомікі Германіі зноў знаходзіцца ў вельмі сумным становішчы», — адзначыў Петэр Адрыян. Паводле яго слоў, многія самазанятыя, прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнесу цяпер перажываюць заняпад, а не развіццё. «З адменай калядных кірмашоў і рынкаў цэлыя галіны перажываюць сцэнарый, аналагічны леташняму», — паведаміў прэзідэнт DIHK.

# НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ПАНДЭМІЮ І САНКЦЫЙНЫ ЦІСК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У параўнанні з такім жа леташнім перыядам гэты паказчык аказаўся вышэйшы на 14,6 %. Рэальныя заробкі выраслі на 4,9 %.

Як адзначылі ў ФПБ, таксама атрымалася значна палепшыць сітуацыю ў тых арганізацыях, дзе склаўся досыць нізкі ўзровень аплаты працы. Так, за дзевяць месяцаў колькасць арганізацый, дзе сярэдняя заработная плата складае менш за 150 працэнтаў мінімальнай зарплаты, зменшылася ў два разы.

Яшчэ адзін немалаважны факт, на які звярнулі ўвагу падчас пасяджэння, — рост заробкаў у бюджэтнай сферы. Упершыню за апошнія гады суадносіны зарплаты бюджэтнікаў да сярэдняй па краіне склалі больш за 80 %.

— Разам з тым у бюджэтных арганізацыях у шэрагу работнікаў па-ранейшаму дастаткова нізкая заработная плата, — падкрэслілі ў нацыянальным прафцэнтры. — І сёння менавіта ў дачыненні да гэтай катэгорыі павінны быць прынятыя сістэмныя меры для паляпшэння сітуацыі.

## «МІНІМАЛКА» ПАВЫСІЦЦА ДА 457 РУБЛЁЎ

Менавіта такі нарматыў мінімальнага ўзроўню аплаты працы адобраны на праведзеным пасяджэнні ведамства. Устанавіць яго прапануецца з 1 студзеня 2022 года.

Як нагадалі ў ФПБ, з 15 лістапада змяніўся парадак устанаўлення мінімальнай заработнай платы. Раней гэты нарматыў зацвярджаўся ўрадам у прывязцы да мінімальнага спажывецкага бюджэту. Цяпер дзейнічае іншы падыход:

— Памер месячнай мінімальнай заработнай платы павінен складаць не менш за 30 працэнтаў прагнознага значэння намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платы па краіне, вызначанай у прагнозе сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Пры гэтым ён устанаўліваецца Саветам Міністраў па прапанове Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, — растлумачылі ў нацыянальным прафцэнтры.



Трэба сказаць, што такі падыход дзейнічае ў многіх краінах.

Як было адзначана на пасяджэнні пры ўстанаўленні новага нарматыву, тэмп росту памеру мінімальнай заработнай платы за студзень 2022 года да студзеня бягучага будзе складаць 114,3 працэнта. У абсалютных лічбах памер «мінімалкі» павысіцца да 457 рублёў.

Дарэчы, паводле даных Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, на 1 студзеня 2021-га памер месячнага мінімальнага заробку складаў 400 рублёў, у верасні (з улікам індэксацыі 6,3 працэнта) — 417, 86 рубля.

Адзначым, што ў пераліку на валюту памер прапанаванай «мінімалкі» будзе супастаўны з устаноўленымі нарматывамі ў суседніх краінах. Напрыклад, у Расіі гэта каля 175 долараў, Малдове — 170, Казахстане — толькі каля 100 долараў.

## БЕСПРАЦОЎЕ НІЖЭЙШАЕ, ЧЫМ НА ЗАХАДЗЕ

А што з занятасцю? Трэба сказаць, што, нягледзячы на ўсе негатыўныя знешнія фактары — пандэмію і незаконны санкцыйны ціск на нашу краіну з боку калектыўнага Захаду, — сёлета па многіх пытаннях бакам сацыяльнага партнёрства ўдалося дасягнуць пэўнага прагрэсу, адзначылі на пасяджэнні.

— У прыватнасці, досыць нізкім застаецца паказчык фактычнага беспрацоўя. Па методыцы Міжнароднай арганізацыі працы сёлета ён не перавышае 4 %. У той час як у шэрагу краін у перыяд пандэміі гэты паказчык значна павялічыўся і ў некаторых краінах Еўрапейскага рэгіёна дасягаў 24 %, — падкрэслілі ў ФПБ.

Пазітыўным момантам з'яўляецца і тое, што значна знізілася колькасць работнікаў, якія з розных прычын вымушаныя былі працаваць няпоўны рабочы час. Гаворка тут ідзе пра скарочаны рабочы тыдзень (дзень), прастоі, вымушаныя водпускі з захаваннем ці без захавання заробку. Напрыклад, калі ў першым паўгоддзі мінулага года 124 тысячы чалавек працавалі ў рэжыме вымушанай няпоўнай занятасці, то сёлета гэты паказчык знізіўся ў 2,7 раза.



Адзначым, што найбольш часта такія сітуацыі сустракаюцца ў прамысловасці і будаўніцтве.

## ВЫХОДЗЯЦЬ З ДАЎГОЎ

Пазітыўна выглядае сітуацыя і з разлікамі па выкананай рабоце, што відаць па скарачэнні колькасці арганізацый, якія маюць запазычанасці перад работнікамі.

У прыватнасці, прафсаюзны маніторынг выявіў больш за 500 выпадкаў несвоечасовай выплаты заробку ва ўсіх сферах эканомікі за год. Прычым тэрмін запазычанасці значэння не меў — усе факты сталі нагодай для выдачы рэкамендацый для выпраўлення парушэнняў.

Па самых апошніх даных, у верасні прафсаюзы выявілі 51 такую арганізацыю, у кастрычніку — 44. Пры гэтым у абсалютнай большасці арганізацый запазычанасць не з'яўляецца сістэмнай і хранічнай. Часта гэта несвоечасовы разлік з работнікам пры сыходзе апошняга ў водпуск або пры звальненні.

— У той жа час, у шэрагу выпадкаў работнікі вымушаныя чакаць законных выплат месяцамі, — адзначаюць у нацыянальным прафцэнтры. — Як правіла, гэта звязана з тым, што прадпрыемства знаходзіцца ў працэдуры ліквідацыі і не мае сродкаў, каб разлічыцца з людзьмі.

Ці ёсць варыянты разліку ў такіх выпадках? На дадзены момант пакуль што не, але прафсаюзы, са свайго боку, настойваюць на неабходнасці больш хуткага прыняцця дакумента аб гарантыях выплаты заработнай платы і пералічэння ўзносаў у ФСАН пры банкруцтве арганізацыі.

Між іншым, не ўсё так дрэнна, як можа падацца на першы погляд. Як адзначылі ў ФПБ, у цэлым большасць арганізацый-даўжнікоў, як і раней, адносіцца да сельскай гаспадаркі. Аднак дзякуючы сумесным дзеянням сацыяльных партнёраў значна палепшылася сітуацыя з выплатай заработнай платы ў арганізацыях сельскай гаспадаркі Віцебскага рэгіёна.

— Калі яшчэ летась там рэгулярна і на працяглы тэрмін затрымлівала выплату заработнай платы некалькі дзясяткаў арганізацый, то, напрыклад, у сёлетнім верасні запазычанасць, прычым нязначная, зафіксаваная толькі ў чатырох арганізацыях, — падкрэслілі ў ФПБ.

## МЯСА І ГАРОДНІНА СТАЛІ ДАРАЖЭЙШЫЯ, А ЛЕКІ ТРЫМАЮЦЦА Ў ЦАНЕ

Тэмай абмеркавання мерапрыемства стала сітуацыя з цэнамі на прадукты харчавання і лекі. Як агучылі на пасяджэнні, цэны на шэраг тавараў павысіліся. Напрыклад, у верасні бягучага года ў адносінах да жніўня каўбасныя вырабы і грэцкія крупы падаражэлі больш чым на 4 %, куры — на 10 %, свініна — практычна на 7 %.

— У гадавым вымярэнні (калі параўноўваць верасень бягучага года да верасня 2020-га) сярод лідараў па росце — традыцыйная для беларусаў гародніна. Капуста стала даражэйшая ў два разы, бульба — больш чым на 70 %, буракі — на 67 %. Меншыя паказчыкі росту нават у тых прадуктаў, якія краіна ў асноўным імпартуе, — адзначылі ў нацыянальным прафцэнтры.

Разам з тым, ёсць і станоўчыя прыклады. Як было адзначана на пасяджэнні нацсавета, дзякуючы сістэмнай дзейнасці ўдалося стабілізаваць сітуацыю з цэнамі на лекі.

Усе ж памятаюць сітуацыю, калі ў пачатку года сур'ёзна падскочылі цэны на найбольш запатрабаваныя лекі? Прычым далёка не заўсёды гэтае павышэнне тлумачылася ростам закупачных цэн або іншымі аб'ектыўнымі прычынамі.

— Усімі зацікаўленымі ведамствамі праводзіцца сістэмная работа, накіраваная на даступнасць запатрабаваных лекаў, — падкрэслілі ў ФПБ. — І як паказвае прафсаюзны маніторынг, цэны па 50 найменнях найбольш запатрабаваных лекаў дастаткова стабільныя.

Цяпер жа ў аптэках амаль няма дэфіцыту:

— У абсалютнай большасці на прылаўках прысутнічаюць лекі, якія карыстаюцца найбольшым попытам. У выпадках адсутнасці тых ці іншых запатрабаваных лекаў або значнага павышэння іх кошту прафсаюзы інфармуюць прадстаўнікоў дзяржорганаў для аператыўнага вырашэння пытання, — рэзюмавалі ў ФПБ.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего ООО «Правовая Стратегия» (220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404, п/я 34) ПРОВОДИТ в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) на основании Решения Экономического суда Минской области от 02.11.2021 по делу № 156Б2142 ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Молодечненский завод металлоизделий» (222310, Минская область, г. Молодечно, ул. Промышленная, 4, УНП 600066567) в составе:**

| № лота | Наименование | Начальная цена, без учета НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Станок токарно-винторезный 163, 1971 год выпуска, заводской № 39156, инвентарный № 01-006 | 7 400,00 | 740,00 |
| 2 | Станок токарно-винторезный SN-401+1500, 1983 год выпуска, инвентарный № 01-010 | 9 600,00 | 960,00 |
| 3 | Станок радиально-сверлильный 2Н55, 1970 год выпуска, заводской № 727, инвентарный № 02-009 | 10 000,00 | 1 000,00 |
| 4 | Станок универсально-заточный 3Е642Е, 1988 год выпуска, заводской № 1249, инвентарный № 03-018 | 7 200,00 | 720,00 |
| 5 | Станок консольно-фрезерный вертикальный 6М12П, 1971 года выпуск, заводской № 1611, инвентарный № 06-012 | 4 800,00 | 480,00 |
| 6 | Полуавтомат для накатки резьбы UPW 12,5+70, 1988 год выпуска, инвентарный № 09-015 | 5 100,00 | 510,00 |
| 7 | Пресс гидравлический листогибочный ПЛГ-01.000.00 ПС, 2010 год выпуска, инвентарный № 26-032 | 11 700,00 | 1 170,00 |
| 8 | Пресс листогибочный кривошипный ИТ1330В, 2011 год выпуска, заводской № 49, инвентарный № 3056 | 50 900,00 | 5 090,00 |
| 9 | Станок круглошлифовальный 3Б153, 1971 год выпуска, заводской № 1344, инвентарный № 03-003 | 3 700,00 | 370,00 |

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Промышленная, 4.

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки (10 % от начальной цены) перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов

«Перад урадам і рэдакцыямі стаіць задача — прыцягнуць цікавасць дзяцей і моладзі да таго, што мы выдаём і пра што гаворым, каб данесці тое пазітыўнае, што адбываецца ў нашай краіне. Не закрываецца нейкімі вузкімі тэмамі, якія падаюцца з трансфармацыяй і няправільнай трактоўкай. Бо моладзь хапае тое, што ляжыць на паверхні, і ёй трэба ў даступнай форме вельмі простай мовай даносіць інфармацыю пра тое, што адбываецца ў краіне, якія ў яе ёсць прэферэнцыі», — акцэнтавала ўвагу Тацццяна Сіманоўская.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Рука дапамогі

# «Цяжка было стрымаць эмоцыі ад убачанага...»

## Саюз моладзі не пакінулі раўнадушнымі праблемы бежанцаў

**Валанцёры Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі былі аднымі з першых сярод тых, хто арганізаваў збор гуманітарнай дапамогі для бежанцаў у стыхійным лагеры на беларуска-польскай граніцы. Літаральна праз лічаныя суткі пасля таго, што здарылася, добраахвотнікі Саюза моладзі за пайдня сабралі тону гуманітарнай дапамогі, распавялі ў ЦК БРСМ. А ўсяго з пачатку сітуацыі на граніцы свае намаганні да агульнай справы прыклалі 70 валанцёраў, было адпрацавана 3,5 тысячы чалавека-гадзін: як на месцы падзей, дзе маладыя людзі дапамагалі з перакладам, фасоўкай і раздачай гуманітарнай дапамогі, пераносам рэчаў бежанцаў, а, бывала, і іх саміх для аказання меддапамогі, так і ў іншых кутках краіны. Напрыклад, тая ж фасоўка прадуктаў і іншых неабходных рэчаў вялася ў Лідзе.**


Фота БРСМ.

Так, на працягу чатырох дзён добраахвотнікі руху «Добрае сэрца» Гродзенскай абласной арганізацыі БРСМ аказвалі дапамогу бежанцам. У валанцёрскі пул для работы на беларуска-польскай граніцы ўвайшлі добраахвотнікі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Шчучынскага дзяржаўнага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя і іншыя. Яны дапамагалі з расфасоўкай правізіі, адзення, раздачай, разгрузкай матрацаў і коўдраў, арганізацыяй гарачага харчавання, прыбіраннем прылеглай тэрыторыі, стыхійнага лагера і транспартна-лагістычнага цэнтра. Працавалі валанцёры і перакладчыкамі.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
25 11 2021 г.

*На агульнай мове*

# Пра Беларусь — у Instagram і TikTok

## Беларуска-кітайскі медыяцэнтр адкрыўся ў БДУ

**Дзейнасць падраздзялення будзе накіравана на папулярызацыю БДУ сярод кітайскіх абітурыентаў і фарміраванне практычных навыкаў у студэнтаў-журналістаў. З улікам падрыхтоўкі кадраў для розных відаў СМІ цэнтр структурна падзелены на аддзелы: сеткавае ТБ, аддзел па рабоце ў сацыяльных сетках і тэхнічны.**

Тут будуць праходзіць семінары, практычныя заняткі па мантажы відэа, апрацоўцы фотаматэрыялаў, падрыхтоўцы журналісцкіх і піяртэкстаў. Цэнтр укамплектаваны сучасным абсталяваннем, камп'ютарамі для відэамантажу і вёрсткі выданняў, інтэрактыўнай панэллю, праектарам, тэлевізарам і іншай тэхнікай. У гэтай жа аўдыторыі будуць рэалізоўвацца адукацыйныя праекты з удзелам вядучых вучоных і практыкаў дзвюх краін.


Фота прэс-службы БДУ.

Прадугледжваецца, што цэнтр стане практычнай пляцоўкай па стварэнні студэнтамі медыйных прадуктаў для студэнцкіх СМІ. Напрыклад, кітайскія студэнты ўжо здымаюць відэасюжэты і рыхтуюць тэксты аб вучобе ў БДУ, жыцці ў Беларусі для WeChat, Instagram і TikTok. Яны бяруць інтэрв'ю ў выкладчыкаў, сваіх сяброў, фатаграфуюць знакавыя славутасці Беларусі.

Адной з мэт работы цэнтра стане наладжванне сумеснай работы беларускіх і кітайскіх студэнтаў у галіне журналістыкі. Яны будуць рыхтаваць аўтарскія матэрыялы для факультэцкай газеты «ЖурФакты», дапамагаць з перакладамі матэрыялаў на беларускую, рускую і кітайскую мовы. За паўтара месяца дзейнасці пілотнай версіі цэнтра было апублікавана больш за 80 матэрыялаў у сацыяльных сетках, а колькасць падпісчыкаў публічных старонак наблізілася да 1500.

Адкрыццё кітайска-беларускага медыяцэнтра стала магчымым дзякуючы адукацыйнаму цэнтру «Яцань» (КНР) і яго заснавальніку Ван Яцаняю, які супрацоўнічае з БДУ з 2012 года. Пры яго ўдзеле адкрыты інфармацыйна-адукацыйны цэнтр БДУ ў КНР (Пекін), цэнтр даўніверсітэцкай адукацыі БДУ (Санья), Інфармацыйны цэнтр для замежных студэнтаў на ФМА, падпісана пагадненне аб выдзяленні грантаў кітайскім студэнтам за высокую паспяховасць і заняткі навуковай дзейнасцю.

Сёння ў БДУ навучаюцца 2177 грамадзян Кітая, з якіх больш за 1300 чалавек — на першай ступені.



# ДРУКАВАНАЕ СЛОВА ЦІ ІНТЭРНЭТ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Паводле яе слоў, нядаўна ў міністэрстве прааналізавалі, як рэалізоўваецца ў краіне дзяржаўная маладзёжная палітыка. Высветлілася, што ў кожным раёне і населеным пункце ёсць цэлы блок работы, прысвечаны гэтым пытанням. Для ініцыятыўнай моладзі існуе вялікая колькасць сацыяльных ільгот і форм падтрымкі.

«Наша дзяржава падтрымлівае маладзёжных лідараў і стварае магчымасці, каб мэтанакіраваны чалавек мог пабудаваць кар'еру і ўнесці ўклад у развіццё і грамадскую дзейнасць. Колькі ў нас у краіне праводзіцца розных мерапрыемстваў для таленавітых і адораных людзей... Колькі канцэртаў і творчых пляцовак арганізавана... Так, выходзяць вялікія раздзелы ў нашых друкаваных выданнях, але не заўсёды моладзь іх чытае. На жаль, колькасць падпісчыкаў на газеты паступова падае. Нездарма нашы буйныя выданні перайшлі ў электронную форму і ўжо такім чынам даносяць да насельніцтва тыя пытанні, якія хацелася б адлюстраваць», — заключыла Таццяна Сіманоўская.

### Медыяадукацыя і важныя навыкі

— Мы не можам сёння забараніць знаходжанне дзяцей і падлеткаў у сацыяльных сетках, адзе мы павінны іх карэкціраваць, — разважае **начальнік упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Аляксандр МАЦЮШОНАК.** — Трэба развіваць медыяадукаванасць у падрастаючага пакалення. Размова не ідзе пра нейкі асобны прадмет у школе, настаўнікі могуць гэта рабіць і ў рамках сваіх прадметаў.

— Паверце, што мы — самыя верныя вашы чытачы і аўтары, — запэўніла, звяртаючыся да прадстаўнікоў дзіцяча-юнацкіх і маладзёжных СМІ **загадчык дзіцяча-юнацкай тэлестудыі Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі Алена АРЭШКА,** — таму што нашы выхаванцы вельмі зацікаўленыя ў публікацыі сваіх матэрыялаў. Вы не можаце сабе ўявіць, якая радасць для іх — убачыць сваё прозвішча ў друкаваным выданні. Кожны год Палац дзяцей і моладзі праводзіць конкурс для юных журналістаў «Зменім свет да лепшага!». Творчае спаборніцтва ладзіцца па чатырох намінацыях: «Найлепшы медыястартап» (удзельнічаюць сайты, паблікі ў сацсетках (відэаканалы, блогі і г. д.), «Найлепшая газета», «Найлепшы аўтарскі матэрыял» і «Найлепшы відэафільм». І роля прафесійных СМІ ў правядзенні конкурсу вельмі важная, таму запрашаем усіх далучацца ў якасці ментараў ці членаў журы.

Алена Арэшка ўпэўнена, што сёння ў клубах юных журналістаў больш важна вучыць рабоце з інфармацыяй, а не проста рыхтаваць будучых «акул пяра». Трэба займацца медыяадукацыяй і развіццём у дзяцей медыякампетэнцый. А журналістыка якраз і факусіруе ўсе гэтыя карысныя веды. Яна дапамагае адбіраць, знаходзіць патрэбную інфармацыю, аналітычна да яе падыходзіць, адрозніваць непраўдзівую ад праўдзівай.

— Фактычна сёння мы ўсе — журналісты, таму што пастаянна ствараем інфармацыйны кантэнт. Але ці нясём мы за яго адказнасць? Я, як прадстаўнік дзіцяча-юнацкай непрафесійнай журналістыкі, лічу, што клубы журналістыкі павінны стварацца ў кожнай школе і ў кожнай установе дадатковай адукацыі, — падкрэсліла Алена Арэшка. — Але тут ужо паўстае пытанне з кадрамі. У сістэме адукацыі дзіцячай журналістыкай займаюцца сацыяльныя педагогі і педагогі-філолагі. Хацелася б звярнуцца да міністэрства адукацыі і інфармацыі, а ці можна стварыць нейкі адзіны партал у дапамогу педагогам, дзе б прафесійныя журналісты дзяліліся ў відэаролліках сакрэтамі свайго майстэрства, расказвалі пра жанры ў журналістыцы, аб стварэнні газеты ці тэлестудыі. Каб кожны ахвотны мог прайсці гэты курс, навучыцца сам і навучыць дзяцей, як правільна працаваць з інфармацыяй і ствараць якасны медыякантэнт. Так, мы праводзім шмат конкурсаў для юных журналістаў, але наспела неабходнасць правядзення журналісцкіх кампусаў. Можна было б на тры-пяць дзён збіраць дзяцей з усіх рэгіёнаў і арганізоўваць для іх майстэрні, дзе іх будуць вучыць працаваць з інфармацыяй. Гэта архіважнае ўменне, вы не ўяўляеце, якая бывае каша ў іх галовах, як ім складана аддзяліць чорнае ад белага, і з гэтым павінны працаваць прафесіяналы.

Мы ўсе ведаем, што кіно і тэлебачанне ствараюць віртуальны свет, і калі за гэта бяруцца «дрэнныя людзі», то такі свет можа быць вельмі небяспечны. А вось адкрыццё ў школах сваіх тэлестудый дапамагло б дзецям апынуцца па іншы бок экрана і даведацца пра законы і нябачныя бакі стварэння віртуальнага свету.

**«У клубах юных журналістаў больш важна вучыць рабоце з інфармацыяй, а не проста рыхтаваць будучых «акул пяра».**

Ідучы на круглы стол, я пацікавілася ў нашых выхаванцаў, што яны думаюць пра друкаваныя СМІ. Дык вось дзеці прапанавалі іх рэдакцыям стварыць навінавы канал у інтэрнэце, дзе штодзённа ці штотыднёва адаптавана да ўзросту дзяцей даваліся б навіны культуры, мастацтва, грамадска-палітычнага жыцця. Каб яны затым маглі гэту інфармацыю выкарыстоўваць на інфармацыйных гадзінах у сваіх школах. Таксама высветлілася, што дзецям малодшага школьнага ўзросту не хапае ў друкаваных СМІ інфармацыі пра апошнія дасягненні навукі, але такая інфармацыя павінна падавацца ў лёгкай форме і даступнай мовай.

### Майстэрства + грамадзянская пазіцыя

Цікава, што ў Мазыры ідэю, выказаную Аленай Арэшкай, ужо рэалізавалі, праўда, пакуль на гарадскім узроўні. Там падчас летніх канікул праводзяць Лясную школу журналістыкі. Пра гэта расказала **кіраўнік клуба «Юны журналіст» Таццяна АНДРЫЕЎСКАЯ.** Аб'яднанне па інтарэсах дзейнічае пры Мазырскім цэнтры творчасці дзяцей і моладзі з 2002 года. За гэты час было падрыхтавана каля 400 медыйных прадуктаў, а 17 яго выхаванцаў абралі журналістыку сваёй прафесіяй. Лагічна, што стратэгічным партнёрам юных журналістаў стала раённая газета «Жыццё Палесся», якая дае пачаткоўцам месца на сваіх старонках.

— Аб чым пішуць юныя журналісты? Аб найлепшых прадстаўніках моладзі, аб праблемах, поспехах, марах і планах сваіх равеснікаў. Артыкул Аляксандра Весялова «Адданая роднаму слову, ці Шчасце быць беларускай», прысвечаны праблеме захавання роднай мовы, быў надрукаваны сёлета ў юбілейным нумары газеты «Чырвонка. Чырвоная змена». А да стагоддзя газеты «Жыццё Палесся» быў выдадзены зборнік «Пяро юных», які ўключае публікацыі 74 юных аўтараў за ўсе гады існавання клуба. Цяпер гэта наша настольная кніга, наш падручнік, летапіс нашага клуба, — падкрэслівае Таццяна Андрыеўская. — З 2018 года юныя журналісты пачалі працаваць над выпускам інфармпраекта «Press-моладзь» на старонках раённай газеты. Таксама было прынята рашэнне стварыць раённую медыякаманду, у якую будуць уваходзіць навучэнцы ад кожнай школы горада — дзеці, якія цікавяцца журналістыкай, і праводзіць для іх чатыры навучальныя сесіі ў год.

Лясная школа журналістыкі ў палатачным лагеры стала ўжо традыцыйнай (толькі два апошнія гады пандэмія ўнесла ў яе дзейнасць свае карэктывы). Хлопцы і дзяўчаты 11—17 гадоў выязджаюць на дзевяць дзён на ўлонне прыроды, каб на свежым паветры адпачыць ад гаджэтаў, інтэрнэту, шумнага горада і нацешыцца добрай кампаніяй, актыўнымі відамі спорту, пешымі паходамі, песнямі каля вогнішча і, галоўнае, навучыцца асновам журналісцкага майстэрства.

Галоўная мэта як і на гуртках, так і падчас лясной школы — развіццё журналісцкіх і камунікатыўных навыкаў і творчых здольнасцяў у хлопцаў і дзяўчат. Заняткі праводзяцца ў фармаце творчых заданняў, для навучэнцаў арганізоўваюцца сустрэчы з цікавымі людзьмі.

Па словах Таццяны Андрыеўскай, лічбавізацыя станоўча паўплывала на дзейнасць клуба. Калісьці ў рэдакцыі накіроўваліся матэрыялы юных аўтараў, напісаныя імі ад рукі, потым на дапамогу прыйшла камп'ютарызацыя, у справу пайшлі дыскеты, CD-дыскі і флэшкі, цяпер жа можна проста адправіць артыкул па электроннай пошце і атрымаць хуткую зваротную сувязь. «А размяшчэнне інфармацыі ў сацыяльных сетках і ў чаце нашага клуба спрыяе прыняццю хуткіх рашэнняў і распаўсюджванню заданняў сярод юных журналістаў. Кожная публікацыя, кожная ўзнагарада (а іх набралася за гады існавання клуба шмат) тут жа знаходзіць адлюстраванне ў нашым чаце і стымулюе ўсіх на творчы пошук, — кажа кіраўнік клуба. — Удасканальваць журналісцкае майстэрства, друкавацца і займаць актыўную грамадзянскую пазіцыю — шчырае імкненне юных журналістаў сёння.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «Цяжка было стрымаць эмоцыі ад убачанага...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Як прыгадвалі добраахвотнікі, на граніцы на той момант знаходзілася больш за дзве тысячы бежанцаў, у тым ліку жанчыны і дзеці. Яны жылі і спалі на зямлі, мелі вострую патрэбу ў ежы, вадзе і леках. На заклік Саюза моладзі адгукнуліся людзі з добрымі сэрцамі. Яны дапамаглі напоўніць каля 200 прадуктовых пакетаў хлебабулачнымі, каўбаснымі вырабамі, вадой, садавінай, гароднінай, малаком, дзіцячым харчаваннем, якія так былі неабходныя малым. Валанцёрам, якія прывезлі гуманітарную дапамогу ў лагер бежанцаў, цяжка было стрымаць эмоцыі ад убачанага...



Дабрачынную акцыю ў дапамогу бежанцам «Саграваючы сэрцам» арганізаваў БРСМ у Магілёўскай вобласці. Яна была абвешчаная ва ўсім рэгіёне. У Магілёве ў ЦУМе працуюць валанцёры — кожны ахвотны можа далучыцца і дапамагчы бежанцам. Хлопцы і дзяўчаты расказваюць жыхарам абласнога цэнтра аб складанай сітуацыі, у якую трапілі людзі, і чаму важна не праходзіць міма чужой бяды. Валанцёры збіраюць цёплае адзенне, прадукты, якія не хутка псуюцца, кансервы, дзіцячае харчаванне, сродкі асабістай гігіены. Гараджане актыўна ўдзельнічаюць у акцыі. Ужо ў першыя дні было сфарміравана больш за 15 пакетаў, і гэта без уліку цёплага адзення. Валанцёры ў Цэнтральным універмагу Магілёва працуюць штодзень з 15.00 да 18.00.

У раёнах Магілёўскай вобласці таксама ідзе збор дабрачыннай дапамогі — людзі могуць звяртацца ў мясцовыя камітэты. Па меры фарміравання пакетаў іх перадаюць абласной арганізацыі Чырвонага Крыжа, якая потым даставіць груз у пункт прызначэння.

Абласная дабрачынная акцыя «Саграваючы сэрцам» працягнецца ў рэгіёне да 3 снежня.

*Першы вопыт*

# ЗАЯЎКІ МАЛАДЫХ І ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ? ПРЫМАЮЦЦА!

**У Мінску прайшло першае пасяджэнне камісіі «Конкурсу маладзёжных ініцыятыў». «Фактычна ў краіне пакладзены пачатак фарміравання грантавай сістэмы ў рамках маладзёжных ініцыятыў», — цытуе БРСМ словы яе старшыні, міністра адукацыі Беларусі Ігара Карпенкі.**

Новы праект, які стартаваў 3 лістапада пад эгідай Саюза моладзі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і Банка развіцця, накіраваны на ўцягванне моладзі ў творчую дзейнасць і сацыяльную практыку. Ён стаў першым вопытам у Беларусі ў гэтым напрамку.

У адрас арганізатараў паступіла ўжо 230 заявак, з іх з улікам прадстаўленых поўных пакетаў дакументаў папярэдняга праходжання... 



хова прайшлі рэгістрацыю 116 праектаў. 48 — атрымалі ацэнку незалежнай экспертызы і былі прадстаўлены ў Рэспубліканскім доме моладзі, 18 — адзначаны камісіяй і рэкамендаваны для падтрымкі.

Каардынатар «Конкурсу маладзёжных ініцыятыў» Варвара Сярова адзначыла, што новы конкурс носіць галосны і сістэмны характар. «Разам з тым патэнцыяльныя праекты-пераможцы павінны быць арыентаваны на большую колькасць юнакоў і дзяўчат, акрамя таго, важна разуменне, на які перыяд часу разлічаны праект. Ішла размова і аб распрацоўцы механізму зваротнай сувязі пераможцаў конкурсу з экспертамі ў частцы рэалізацыі праекта і выкарыстанні атрыманых сродкаў», — распавяла сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ.

Нагадаем, у верасні бягучага года Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падтрымаў стварэнне ў краіне сістэмы малых грантаў на рэалізацыю маладзёжных ініцыятыў. Размова ішла ў першую чаргу аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве, рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў.

Да ўдзелу ў «Конкурсе маладзёжных ініцыятыў» запрошаны маладзёжныя і дзіцячыя грамадскія аб'яднанні, установы адукацыі і арганізацыі. Для атрымання малога гранта на конкурснай аснове неабходна на працягу лістапада накіраваць свае заяўкі на адрас арганізатараў. Умовы падрабязна ўказаны ў палажэнні конкурсу, у тым ліку спосабы падачы заявак як анлайн, так і афлайн.

Як падаць заяўку? Да канца лістапада можна даслаць яе на электронны адрас proekt.brsm@gmail.com з пазнакай «Заяўка на конкурс» з арыгіналамі пакета конкурсных дакументаў і іх электроннай версіяй на адрас: г. Мінск, вуліца Карла Маркса, 40.

*Новыя старты*

# Да «Зімовага маршруту» будзь гатовы!

**Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ правёў вучэбны інтэнсіў «Школа падрыхтоўкі камандных саставаў атрадаў патрыятычнага праекта «Зімовы маршрут — 2022» для кіраўнікоў гэтага працоўнага праекта, паведаміла афіцыйны прадстаўнік Цэнтральнага камітэта БРСМ, камандзір штаба Надзея Шахоўская.**

«Традыцыйна мы пачынаем падрыхтоўку кіраўнікоў працоўных праектаў задоўга да іх пачатку. Патрыятычны праект «Зімовы маршрут» не выключэнне. На гэты раз мы дыслацыраваліся ў Мінскім раёне. Навучанне прайшлі 40 чалавек з усіх рэгіёнаў. Праграма была насычана камунікатыўнымі інтэрактывамі, трэнінгамі, майстар-класамі, праведзеннем комплексу працоўных чэленджаў, патрыятычных акцый, прафарыентацыйных мерапрыемстваў для школьнікаў розанага ўзросту», — расказала Надзея Шахоўская.

На другі дзень было запланавана правядзенне навукова-папулярнага інтэнсіву «АЭС на далоні». «Гэты інтэнсіў закліканы пазнаёміць камандны склад студэнцкіх атрадаў з актуальным парадкам дня атамнай галіны і павысіць кампетэнцыі ў сферы публічных выступленняў перад маладзёжнай аўдыторыяй. Яго праграма будавалася па пяці напрамках, сярод якіх «Сучасныя атамныя тэхналогіі», «Беларуская АЭС», «Міфы аб атамнай энергетыцы» і прадугледжвала выключна інтэрактыўны фармат, у прыватнасці дыялогі з экспертамі ў галіне інжынернай радыёэкалогіі і радыёхімічнай тэхналогіі, інтэлектуальныя і камандныя гульні, камунікатыўныя гульні-дыскусіі і нават квэсты», — дапоўніла яна.

Завяршылася навучанне прэзентацыяй практычных прапаноў для ўключэння ў адзіную праграму «Зімовага маршруту — 2022». «У гэтым годзе мы плануем задзейнічаць у патрыятычным праекце ўсе шэсць абласцей — 126 студэнтаў. Праграма будзе звярстана ўжо да пачатку снежня, а адразу пасля заканчэння інтэнсіву на конкурснай аснове стартуе набор у шэсць атрадаў зімовага маршруту. Колькасць месцаў абмежаваная — па 21 чалавеку ў кожны атрад», — рэзюмавала Надзея Шахоўская.

Упершыню патрыятычны працоўны праект «Зімовы маршрут», арганізатарам якога выступае Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і органаў выканаўчай улады, стартаваў у студзені 2021 года. Маладзёжная ініцыятыва была арыентавана на прафарыентацыйную работу ў сельскіх школах, адрасную дапамогу пажылым людзям з акцэнтам на грамадзянска-патрыятычны вектар. З 23 да 31 студзеня студэнцкія атрады «Зімовага маршруту» пераадолелі больш як 1,6 тысячы кіламетраў па Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях з правядзеннем прафарыентацыйных інтэрактываў і тэматычных заняткаў, канцэртных і сацыяльна значных праграм.

*Агульны інтарэс*

# ЗАПРАШАЕ СТУДЭНЦКАЯ ПРЫЁМНАЯ

**Члены Рэспубліканскай студэнцкай калегіі пры Цэнтральным камітэце Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі правялі асабісты прыём прадстаўнікоў студэнцкай моладзі ўстаноў вышэйшай адукацыі.**



У Міжнародны дзень студэнта ў рэгіёнах краіны і Мінску ўпершыню пачалі працаваць асабістыя студэнцкія прыёмныя. Такое калегіяльнае рашэнне, у тым ліку і ў падтрымку развіцця новай стратэгіі развіцця БРСМ, было прынятае на выязным пасяджэнні калегіі ў Магілёве.

Саюз моладзі паставіў для сябе прыярытэтам часцей бываць у студэнцкіх аўдыторыях, сустракацца з моладдзю, ведаць і дапамагаць вырашаць яе праблемныя пытанні і чакае эфект ад работы студэнцкіх прыёмных, паколькі гэта дадатковая магчымасць у нефармальнай абстаноўцы выслухаць хлопцаў і дзяўчат, падтрымаць маладзёжныя ініцыятывы.

Аб'яднаныя студэнцкія прыёмныя працавалі на базе Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, Беларуска-Расійскага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка.

Сетка студэнцкіх прыёмных будзе пашырана, і са снежня бягучага года яны запрацуюць на пастаяннай аснове пры пярвічных арганізацыях БРСМ у кожнай ВНУ.

Рэспубліканская студэнцкая калегія створана пад эгідай ЦК БРСМ у 2019 годзе. Калегіяльны орган, у які ўваходзяць прадстаўнікі кожнай установы вышэйшай адукацыі, з'яўляецца пляцоўкай для згуртавання студэнцкай моладзі і вырашэння надзённых праблем, падтрымкі сацыяльна значных ініцыятыў і маладзёжных праектаў.

*У ліку найлепшых*

# СА СПАГАДАЙ У СЭРЦЫ

## Для добраахвотнікаў граніцы — свая намінацыя

**У Рэспубліканскім доме моладзі журы падвяло вынікі конкурсу «Валанцёр года — 2021».**

Гэта зрабілі прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі, працы і сацыяльнай абароны, БРСМ, Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра, Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства. Журы разглядзела 63 заяўкі і вызначыла пераможцаў сярод трох катэгорый моладзі ў традыцыйных намінацыях праекта «Асабісты ўклад», «Найлепшы валанцёрскі атрад», а таксама новых — «Прамаролік» і «Валанцёрская песня». Таксама сёлета калегіяльным рашэннем ЦК БРСМ заснавана дадатковая намінацыя конкурсу. Вырашана аддзячыць гуманітарных валанцёраў за іх бескарыслівую працу ў складанай сітуацыі на беларуска-польскай граніцы. Як адзначаецца, гэта цудоўная нагода сказаць «дзякуй» добраахвотнікам, у тым ліку і валанцёрам граніцы. Для іх заснавана спецыяльная прэмія (намінацыя) «Гуманітарныя валанцёры Беларусі». Імёны ўсіх пераможцаў стануць вядомыя 4 снежня, напярэдадні Міжнароднага дня добраахвотнікаў, падчас фінальнага мерапрыемства ў Мінску.

Конкурс, накіраваны на папулярызацыю і развіццё валанцёрскага руху ў Беларусі, выяўленне і заахвочванне лідараў валанцёрскага руху, праводзіўся ў лістападзе ў тры туры (раённы, абласны, рэспубліканскі). Арганізавалі праект Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, Міністэрства адукацыі, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, абласныя (Мінскі гарадскі) выканаўчыя камітэты, грамадскія арганізацыі і аб'яднанні.

**Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота з сайта БРСМ.**

SEX=БАЛЯСЫ

# «Маленькія Веры» нашага часу

**Савецкі фільм «Маленькая Вера» калісьці меў вялікі поспех. Хоць ён нясе вельмі глыбокі сэнс, некаторыя гледачы прыходзілі на яго толькі дзеля вядомай усім эратычнай сцэны. А з'явілася яна так. Калі быў зняты практычна ўвесь фільм, рэжысёр Васіль Пічул прагледзеў матэрыял і зразумеў, што карціне не хапае нейкай пярчынкі. («З паказанняў пацярпелай: — Ляжу са сваім, а тут мой заходзіць».) Ён сабраў здымачную групу і паставіў перад усімі задачу — зрабіць сцэну, якая магла б захапіць гледача. І такі эпізод быў прыдуманы. У сцэнарыі нічога падобнага не было, а акцёрам нялёгка было справіцца з задачай. Сцэну ўсё ж знялі, але аператару прыйшлося хавацца ў шафе, каб не бянтэжыць выканаўцаў галоўных роляў. («Жонка слухала аповед мужа пра тое, як ён усю ноч правёў у бальніцы каля ложка цяжка хворага Каляна, і маўчала. Калян у шафе таксама маўчаў».) Сёння гэты эпізод у ложку здаецца нявінным, а на савецкага гледача ён зрабіў вялікае ўражанне і не на ўсіх станоўчае. Але ў канцы 1980-х гадоў такім чынам праз эратычны прыём большасці адкрывалі вочы. Не, не на секс, а ўвогуле на жыццё, на ўзаемаадносіны бацькоў і дзяцей, на пошук чалавекам свайго месца ў жыцці... Што змянілася з тых часоў, дзеля чаго эротыка выкарыстоўваецца зараз? («— Дзяўчына, можна з вамі пазнаёміцца? Вы такая сексуальная!» — «Канешне. А якая ў вас зарплата? Калі такая ж, як у майго мужа-небаракі, дык вы ў пралёце». — Воля, ну вось ты мне скажы, як можна згуляць з табой у ролевую гульню «Незнаёмец і незнаёмка»?)**


Кадр з фільма «Маленькая Вера».

Аргенцінская мадэль і тэлевядучая Сінція Фернандэш агітавала за сваё абранне ў кангрэс «гарачым» спосабам. У невялікім перадвыбарным роліку яна ў нейкі момант падчас танца зрывае з сябе спадніцу і, застаўшыся ў сподні і панчохах, пачынае так «запальваць», што, як той казаў, і не хацеў хадзіць на галасаванне, а пойдзеш. Ды што там — пабяжыш! («Прамовіў муж уздыхаючы, гледзячы на прывабнасці жонкі: — Была б ты чужая баба — табе не было б цаны».) У сваім «Інстаграме» Сінція апярэдзіла хейтараў з іх гнеўнымі каментарыямі: «Я ўжо прадбачу фразы накшталт: паглядзіце на гэтага троля, паглядзіце на клоўна, які нічога не ўмее рабіць, чаго ты ад яе чакаеш, якая ганьба, бо твае дочкі скажуць: гэта адзінае, што яна ўмее рабіць. Мая «задніца» — гэта проста кручок, каб прыцягнуць увагу, і ведаеце што? («Чапляць мужыкоў лепш за ўсё каля прымерачных. Мужык пойдзе адтуль з любой жанчынай, якая скажа яму, што шопінг скончаны і пара дадому».) Паказваючы яе, я не спадзяюся, што выбаршчыкі прыйдуць і прагаласуюць за мяне менавіта з-за гэтага. Паглядзім праўдзе ў вочы: ніхто не будзе галасаваць за вас, таму што ў вас класная «пятая кропка» і вы ім падабаецеся!» Фернандэш заяўляе, што, наадварот, усе нападкі апанентаў распальваюць у ёй упэўненасць у правільнасці свайго рашэння. Ідучы ў кангрэс, яна хоча дабіцца таго, каб дзеці ў аргенцінскіх сем'ях, асабліва шматдзетных, былі больш абароненыя, каб іх маці не ламалі галаву над тым, чым накорміць сваё патомства, калі муж страціў працу. («Разумная жанчына заўсёды адпускае пагуляць свайго мужа, а мудрая — яшчэ і з сабакам...»)

А 16-гадовая дачка супермадэлі Монікі Белучы і акцёра Венсана Касэля Дзева падзялілася «гарачымі» здымкамі ў адкрытых вобразах і парадавала фанатаў. Яна апублікавала кадры, на якіх пазіруе ў гамаку ў ніжняй бялізне. Акрамя гэтага, дзяўчына знялася ў гарнітуры, які складаецца з кроп-топа з глыбокім дэкальтэ і спадніцы, а таксама ў лонгсліве, які агаляе грудзі. («Паважаныя выпускніцы! Маленькая парада: не выкідвайце сваю школьную форму. Яна вам потым яшчэ вельмі спатрэбіцца ў сямейным жыцці!») Падпісчыкаў захапілі новыя фота Касэль, пра што яны прыняліся пісаць у шматлікіх каментарыях. «Проста прыгажуня», «Такая ж цудоўная, як і маці!», «Незямная», «Проста найлепшая», «Няма слоў», «Цудоўная Дзева», — выказваліся прыхільнікі. («— Мам, падобна, я ніколі не выйду замуж... — Ды кінь ты. Нехта ды лаханецца».)

Але што можна пану, тое не Івану... У Падмаскоўі школьніца адправіла аднакласніку фота з ваннага пакоя і апынулася... у дзіцячым доме. Дзіця вярнулі ў сям'ю толькі пасля таго, як гісторыя прыцягнула ўвагу грамадскасці. У Сергіевым Пасадзе органы апекі забралі 14-гадовую дзяўчынку проста са школы і на працягу тыдня адмаўляліся вярнуць яе маці. Падставай для гэтага паслужыла фота ў ручніку, якое дзяўчынка адправіла аднакласніку ў асабістай перапісцы. («Дыялог адзінаццацікласніц на перапынку: — Даша, ну якія яшчэ дзве палоскі?» — «Ну, я забылася, як гэта называецца!» — «Выказнік!») «Дачка на канікулах зрабіла ўпотай у ванным пакоі пару фота ў пляжным стылі. Нічога непрыстойнага там не было, проста дурныя фота, на якіх яна ручніком прыкрывала большую частку цела. Адправіла хлопчыку, а ён усё выклаў у сацсетку. Іх тут жа спампавалі, паказалі класнаму кіраўніку», — распавяла мама дзяўчынкі. («Самы лепшы настаўнік — вопыт. Бярэ, праўда, дорага, але тлумачыць даходліва».) Настаўніца палічыла фота занадта адкрытым і паведаміла аб гэтым органам апекі, якія неадкладна прыехалі ў школу і забралі дзіця. («Каця так моцна разгайдалася на арэлях, што ўбачыла, чаму бацькі адправілі яе пагуляць у двары».) Камісія па справах непаўналетніх прыняла ў маці заяву толькі пасля таго, як гісторыя выклікала грамадскі рэзананс.

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Карціны — як удары камертона»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Тады, згадвае ён, педагогі па выяўленчым мастацтве прапанавалі мне паступаць у наступным годзе. Настаўніца на падрыхтоўчых курсах з аднаго боку, падтрымлівала жаданне хлопца пісаць, як падказвала душа, а з іншага — казала, што трэба звяртацца да чагосьці прадыктаванага. «Я даведаўся, што так рабіць мне прыйдзецца ўвесь час вучобы ў вучылішчы, мне здалося гэта катаргай. Чым больш на падрыхтоўчых курсах былі задаволены мной і ў цэлым станоўча выказваліся аб рабоце, тым менш я быў задаволены вынікамі сваёй работы, і ў нейкі момант мне станавілася балюча ад гэтага. Неяк натуральна я прыняў рашэнне, што не буду вучыцца ў гэтай установе», — тлумачыць свой выбар наш герой.

Павел Сарока з тых свабодных мастакоў, якія лічаць, што неабавязкова абсалютную чыстую свабоду вытрымліваць у пэўных формах, канонах. Малады мастак мяркуе, што асноўныя класічныя правілы мастацтва, вядома, добра было б ведаць, мець у сваім інструментарыі, але дыдактыку, так званую дыктатуру, якая насаджаецца, вытрымліваць — не ў яго характары.

Пасля заканчэння 11 класа творца выбраў прафесійна-тэхнічны каледж дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя М. А. Кедышкі. Вучоба па спецыяльнасці «Ганчарства, мастак-афарміцель» давала навучэнцу пэўную свабоду. «Куратар-майстар казаў, што я выкарыстоўваю памяшканне каледжа як уласную майстэрню, — смяецца герой. — Пакуль мае аднакурснікі ў Год авечкі ляпілі па 40 баранаў у ганчарнай майстэрні, я ляпіў незвычайную такую кветку свядомасці, пялёсткі якой былі як розныя станы чалавека, такі, так бы мовіць, кветнік, што распускаецца рознымі псіхічнымі станамі. Натуральна, гэта не ва ўсіх знаходзіла адабрэнне», — гаворыць мастак. Аднак былі і тыя, хто разглядзеў у Паўле выключны талент. Студэнт Сарока там адразу пасябраваў са сваім выкладчыкам пластычнай анатоміі. Павел Эдуардавіч Куніцкі — вядомы айчынны скульптар. «Цяпер мы вельмі блізкія, — дзеліцца малады творца. — Сяброўства з гэтым чалавекам — мой дзіўны набытак адтуль».

Падчас вучобы наш герой заседжваўся за работай падоўгу — сыходзіў з майстэрні, калі на змену дзённаму вартаўніку прыходзіў начны. Некаторыя настаўнікі адносіліся да яго з паразуменнем, давалі ключы ад майстэрань, аднак не ўсе. «Я быццам бы кідаў ім выклік, — кажа мастак, — хоць ніколі не дазваляў сабе кагосьці абражаць, проста заўсёды рабіў тое, што мне падабаецца. І я быў выключаны з праграмы, мог бы аднавіцца ў каледжы, аднак не стаў гэтага рабіць», — дзеліцца хлопец.

Неяк у малодшай школе з Паўлам здарыўся такі выпадак: ён адчуў, што яго не любіць настаўніца: «Памятаю, яна адвяла мяне ўбок і сказала: мы тут для таго, каб вучыцца, а не для таго, каб любіць». Пазней, калі Павел займаў у старшых класах першыя месцы ў конкурсах па літаратуры і аратарскім майстэрстве, ён жадаў сустрэцца з той настаўніцай. «Хацеў сказаць, што нельга нечаму навучыцца, не палюбіўшы тое, а палюбіўшы, чалавек імгненна гэтаму вучыцца, бо любоў і навучанне — сінонімы».

Сапраўдны мастак, па меркаванні героя, гэта заўсёды нейкае новае вымярэнне эстэтыкі, сэнсаў. Ён, як Сталкер у Таркоўскага, ідзе за межы невядомага. «На мой погляд, любое паўнавартаснае мастацтва мае свае законы, свой макракосмас, сваё ўнутранае ўладкаванне і, натуральна, карціны самабытнага мастака нельга звводзіць да жанравасці. Магчыма, падабенства і пэўныя ўплывы магчыма заўважыць, аднак у фундаментальным сэнсе ў кожнага мастака аб жанры гаворка ісці не можа — гэта прамы шлях у нікуды», — упэўнены наш герой.

Мастацкія работы Паўла Сарокі напісаны алеем, ёсць і графіка, але ў цэлым апошнія гады аўтар эксперыментуе. У яго маюцца карціны і маштабныя, як, напрыклад, твор «У пошуках запаветнай зямлі» (2,5 метра), і невялікія, гэта звычайна што датычыцца графікі. «Я ў залежнасці ад задач выкарыстоўваю розныя матэрыялы, — гаворыць мастак. — У прыватнасці, у маштабных работах выкарыстана аэраграфічная тэхніка. Мне важна перадаць у жывапісе спачатку розную дзейнасць згушчанага жыцця, а пасля ўжо ўнутры змяшчаць фармальныя аб'екты ў выглядзе вобразаў, фігур і г. д. На першым узроўні — субстанцыі жыцця, якія перадаюцца праз ушчыльненыя жывапісныя слаі, з чаго ўтвараецца такі своеасаблівы крышталь. Менавіта метад аэраграфікі дазваляе паветрана, амаль эфірна, снападобна наносіць на гэтую крышталічную жывапісную структуру пэўныя вобразы», — расказвае мастак.


Два Адама. Выратаванне ў лёсе. 2012 г.

Для творцы важна, каб у яго карцінах прысутнічала жыццё. Павел тлумачыць, што яго работы — як жыццёвы факт, як успышка, у якой чытаюцца пэўныя вобразы, аб'екты, выводзяцца пачуццёвыя элементы. Работы Паўла Сарокі выстаўляліся ў сталічнай бібліятэцы імя Янкі Купалы, у «Грай-кафэ», на розных калектыўных выстаўках, напрыклад падчас Тыдня дызайну на Кастрычніцкай, паэтычных вечароў на Зыбіцкай. «Мне блізкія кінематаграфічныя і славесная формы, інтэгральная, інклюзіўная прастора, дзе выяўленчае мастацтва існуе побач з вершаскладаннем, так бы мовіць, уяўляючы сабой пэўны корпус — як тэкст каля карцін», — расказвае Павел.

У планах мастака — зладзіць выстаўку, у якой будзе месца і ўласным вершам, і тэатральным пастаноўкам, і музыцы, з якой Паўлу гатовыя дапамагчы сябры-музыканты. «Іншымі словамі, гэта будзе тэрыторыя пачуццяў, каб у чалавека, які прысутнічае на выстаўцы, узнік вопыт перажывання. Будучая выстаўка мне ўяўляецца вельмі маштабным мерапрыемствам. Цяпер галерея ў класічным сэнсе сябе зжыла, мне здаецца, трэба распрацоўваць іншыя формы», — падагульніў ён.

Малады творца раіць будучым мастакам шукаць крыніцы, якія наталяюць, чытаць кнігі, што натхняюць, дабратворных людзей. На яго думку, у справе мастацтва неабходны энтузіязм, а яшчэ трэба рухацца ў той бок, дзе ёсць Божая сіла.

**Надзея ЗУЕВА.**

**Фота з архіва героя.**

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 24.11.2021 г.

**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 27 декабря 2021 г. в 11.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – здания магазина, принадлежащего Гомельскому областному потребительскому обществу на праве собственности**

**Состав лота № 1:**
**Здание магазина, инв. № 334/С-12509.** Адрес: Гомельская обл., Лельчицкий р-н, г. п. Лельчицы, ул. Коммунальная, 16. Назначение: здание специализированное розничной торговли. Одноэтажное строение 1956 года постройки. Общая площадь – 126,9 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка, сарай, уборная, ограждение

**Начальная цена лота: 31 320,00 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %).
**Задаток: 2 700,00 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

Земельный участок для обслуживания здания на праве постоянного пользования площадью **0,0499 га** с кадастровым номером **322855100001001530**. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 24 декабря 2021 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 10.00 до 11.00 **27 декабря 2021 г**. Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.
**При подаче заявления участник должен иметь:** 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь необходимые реквизиты.
Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с № BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 25 ноября 2021 г.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 15 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не будет достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объекта, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23, тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95; 8 (029) 170-46-47.**
**Сайт: gino.by • e-mail: auction-gino@gino.by**
**Продавец: Лельчицкий филиал Гомельского облпотребобщества, Гомельская область, г. п. Лельчицы, ул. Советская, 64, тел.: 8 (02356) 2-03-08, 2-07-70, 8 (029) 140-80-66**

---

**Информация о проведении повторного аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего**

## ОАО «Химчистка и стирка белья»

**Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации»,** 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, тел.: 8-0222-42-25-64, 8-029-15-15-444.

**Повторный аукцион состоится 8 декабря 2021 года в 15.00 в конференц-зале ОАО «Универмаг «Центральный» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 61.**

**Предмет аукциона** (наименование объекта, его местонахождение, арендуемая площадь, кв. м):

**ЛОТ № 1**
- изолированное помещение с инв. № 700/D-152301 общей площадью 363,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 179-2;
- изолированное помещение с инв. № 700/D-152300 общей площадью 156,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 179-1;
- капитальное строение (склад) с инв. № 700/С-81484 общей площадью 78,0 кв. м; капитальное строение (склад) с инв. № 700/С-81483 общей площадью 128,0 кв. м; капитальное строение (благоустройство территории) с инв. № 700/С-106077 общей площадью 3315,4 кв. м; ворота металлические; ограждение металлическое; эстакада железобетонная, расположенные по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 159.

Начальная цена продажи – 93 500 руб. 00 коп. (с учетом НДС).
**Начальная цена продажи снижена на 15 %.**
Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (обеденный перерыв – с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.
**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 7 декабря 2021 года до 13.00.**
Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.

**Информация об опубликовании извещения размещена на официальных сайтах**
Могилевского областного исполнительного комитета **www.mogilev-region.gov.by**,
Могилевского городского исполнительного комитета **www.mogilev.gov.by.**

УНП 700008710

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** | | |
| **Продавец** | **ООО «СпецЛесПартнер», Минская область, Узденский район, аг. Дещенка, ул. Школьная** | | |
| **Предмет аукциона: спецтехника, бывшая в употреблении, снята с учета расположенный по адресу: Минская область, Узденский район, д. Королево, ул. Советская, 16** | | | |
| **Лот № 1** | Марка (модель), тип ТС, рег. знак, год выпуска | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
| | **Грузовой сортиментовоз MAZ 6303A8**, 2012 г. в. | 75 000,00 | 3 750,00 |
| | **Прицеп специальный сортиментовоз MAZ 837810-22,** 2012 г. в. | | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа: ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты за организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **3 (три) процента** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **28.12.2021 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **24.12.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мирополье» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже**

## ПРОИЗВОДСТВЕННОГО ЗДАНИЯ

**с инвентарным номером № 610/С-62494 общей площадью 218,3 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620887400001000817 (право аренды по 16.09.2024) площадью 0,2783 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, 14, восточнее д. Бытча.**

*Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: водоохранная зона реки, водоема, пл. 0,2783 га; охранная зона электрических сетей, пл. 0,0010 га.*
Начальная цена с НДС (20 %) **– 4 161,86** бел. руб.
*Начальная цена снижена на 80 %.*
Задаток 10 % от начальной цены – **416,00** бел. руб.)
**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330 000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.
Организатору аукциона – вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.
Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» 02.07.2021, 24.08.2021.
Аукцион состоится **09.12.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра (8044) 555-25-91.**

УНН 600134365

---

## ОАО «ПИНСКИЙ ВИНОДЕЛЬЧЕСКИЙ ЗАВОД»

**сообщает о проведении 29.12.2021 г. первых электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества:**

1. Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-63750, наименование – **квартира № 2,** площадь 41,2 кв. м, Брестская обл., Пинский р-н, Молотковичский с/с, п. Садовый, ул. Совхозная, 10-2 – 5 600 белорусских рублей без НДС.
2. Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-63849, наименование – **квартира № 3,** площадь 40 кв. м, Брестская обл., Пинский р-н, Молотковичский с/с, п. Садовый, ул. Совхозная, 10-3 – 5 300 белорусских рублей без НДС.

Подробную информацию можно узнать на сайте **bankrot.gov.by.**

УНН 200110728

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Лот 1: право заключения договора аренды сроком на 5 лет части капитального строения с инв. № 420/С-50985 по адресу: г. Лида, ул. Варшавская, д. 47, корп. 2, площадью 225,8 кв. м.**
Размер ежемесячной арендной платы: 152,415 базовой арендной величины.
Условия проведения аукциона: целевое назначение арендуемых площадей – под продовольственный магазин.
Начальная цена продажи объекта – 667,80 руб. (шестьсот шестьдесят семь рублей восемьдесят копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 66 руб. (шестьдесят шесть рублей)

Условия расчетов и заключения договора аренды:
- срок подписания договора аренды – 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона с представлением копии платежных документов перечисления суммы за право заключения договора аренды;
- срок оплаты – 3 рабочих дня с даты подписания протокола о результатах аукциона (но до заключения договора аренды)

**Продавец – ОАО «Завод Оптик», 231300, г. Лида, ул. Машерова, 10, тел. 8-0154-61-12-45**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Номер р/с для перечисления задатка BY44BLBB30120500833225 001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 27 декабря 2021 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 212**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 23 декабря 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 8-0152-55-87-71**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/**

---

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОАО «Берестовицкая ПМК № 141»** (УНП 500020631), объявляет о проведении **07.12.2021 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке:** https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/11/imushhestvo-berestoviczkaya-pmk-torgi-7.12.21.pdf
**Местонахождение имущества:** Гродненская область, Берестовицкий район, г. п. Большая Берестовица, пер. Советский, д. 7.
Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.
**Продавец:** ОАО «Берестовицкая ПМК № 141», тел. +375293923903.
**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.
Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **06.12.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).
Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 25.11.21** по **17.00 06.12.21** на bankrottorg.by. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.
Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.
Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.
Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.
В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; по лотам №№ 108, 110, 11, 112, 138, 139 – **7 %** от цены реализации предмета торгов; по лотам №№ 127, 129, 130, 131, 135, 136, 137 – **2 %** от цены реализации предмета торгов.
Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.
Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
**извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества ОАО «Лунинецкий райагросервис»** (Продавец)

**Лот № 221121001: Изолированное помещение АБК,** инв. № 133/D-9242, 3086,2 кв. м. Адрес: г. Лунинец, ул. Красная, 160 – 2.
Обременение: аренда (полный список на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»).
Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. – 667 764,00.
Задаток – 66 776,40 бел. руб. Шаг электронных торгов – 5 %.

**Лот № 221121002: Топливо-заправочный пункт,** инв. № 133/С-14477 и составные части и принадлежности (полный перечень на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»). Адрес: г. Лунинец, ул. Красная, 160/1.
Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. – 130 000,00.
Задаток – 13 000,00. Шаг электронных торгов – 5 %.

**Электронные торги состоятся 22.12.2021 с 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»).**

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел).
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X, УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатков – **20.12.2021 в 11.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • www.торги.бел • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Сумесны выпуск газеты «Звязда»
і Міністэрства прыродных рэсурсаў
і аховы навакольнага асяроддзя
№ 8 (62)

# ПЛАСТЫК: ВЫКАРЫСТАЦЬ НЕЛЬГА ЗАМЯНІЦЬ

## Эксперты расказалі пра асноўныя напрамкі работы з адходамі, якія рэалізоўваюцца ў краіне

### СУПРАЦЬ ЭТЫКЕТАК І ПАКЕТАЎ

Цяпер у нас выкарыстоўваецца больш за 80 % другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), якія ўтвараюцца ў складзе адходаў вытворчасці, а вось узровень выкарыстання камунальных адходаў пакуль не перавышае 30 %, але паступова расце. У рэестры аб'ектаў па выкарыстанні адходаў зарэгістравана каля дзвюх тысяч такіх аб'ектаў і ствараюцца новыя, абазначыў **Максім ТАРАСАЎ, начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды.**

*Аднак самая актуальная экапраблема — пластыкавая. У Беларусі штогод ствараецца 150 тысяч тон пластыкавага смецця ў складзе адходаў вытворчасці і 280 тысяч тон — у складзе камунальных адходаў. На сённяшні дзень рэалізоўваецца план па паэтапным замяшчэнні пластыкавай упакоўкі экалагічна бяспечнай.*

З гэтага года забаронена, напрыклад, выкарыстанне пластыкавага посуду на аб'ектах грамадскага харчавання. А патрэба ў такіх вырабах у гэтым сектары — 200 млн адзінак, заўважыў эксперт. Замест пластыку для стварэння відэльцаў, нажоў, лыжак, трубачак для напояў выкарыстоўваецца драўніна. Кубачкі, упакоўкі для піцы, палачкі для размешвання, латкі таксама робяцца з экалагічна бяспечных матэрыялаў.

А ў межах ЕАЭС Мінпрыроды разам з усімі зацікаўленымі працуе над унясеннем змяненняў у Тэхрэгламент Мытнага саюза аб бяспечнасці ўпакоўкі. У прыватнасці, над абмежаваннем выкарыстання поліхларыраванай этыкеткі на ўпакоўцы з поліэтыленгэрэфталату (простымі словамі — ПЭТ-бутэлькі). А таксама абмежаваннем выкарыстання тонкіх поліэтыленавых пакетаў таўшчынёй да 50 мікрон і ўжываннем замест іх оксіраскладальной упакоўкі і ўпакоўкі з успененага полістыролу.

### РАСЛІННЫ ГРУНТ, СТРЭЙЧ-ПЛЁНКА І ШКЛАБОЙ

Сёлета ў Беларусі было сабрана амаль 600 тысяч тон ДМР, якія пойдуць на перапрацоўку. Працягваецца і работа над стварэннем новых тэхналогій, якія змогуць даць другое жыццё смеццю, што дагэтуль не перапрацоўвалася. Так, напрыклад, распачата работа над утылізацыяй камбінаванай упакоўкі тыпу тэтрапак, а ў сталіцы на прадпрыемстве «Зеленбуд» створана вытворчасць па выкарыстанні арганічнай часткі смецця. На выхадзе тут мяркуюць атрымліваць 28 тысяч «кубоў» карыснага расліннага грунту ў год.



А на заводзе «Краснасельскбудматэрыялы» ўсё гатова для выкарыстання RDF-паліва са смецця, абазначыла **Наталля ГРЫНЦЭВІЧ, дырэктар прадпрыемства «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»**.

Пастаянна прымаюць ад насельніцтва і нарыхтоўваюць ДМР таксама і ў арганізацыях спажыўкааперацыі, падкрэсліла **Аксана СКІНДЭР, начальнік упраўлення нарыхтовак Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў «Белкаапсаюз»**:

*— Прынамсі, летась людзям было выплачана 153 млн рублёў за прынесеныя рэсурсы, а за няпоўны 2021-ы — ужо 230 млн. А ў агульным аб'ёме нарыхтоўкі ДМР нашы таварыствы забяспечваюць чвэрць.*

Створана інтэрактыўная карта, на якой пазначана схема размяшчэння нарыхтовачных пунктаў, нумары іх тэлефонаў.

У Беларусі дзейнічае класіфікатар адходаў, згодна з якім у краіне можа ўтварацца больш за 2100 найменняў адходаў. Пры гэтым на шэсць з прыведзеных пазіцый прыпадае каля дзвюх трацін ствараемага ў краіне прамысловага смецця, а перапрацоўваецца — каля 800 пазіцый, заўважыла **Кацярына БАЦЯН, загадчык аддзела абыходжання з адходамі БелНДЦ «Экалогія»**:

*— Летась у краіне ўтварыўся 61 млн тон адходаў, з якіх дзве траціны — буйнатанажныя. Больш як 80 % адходаў вытворчасці ў краіне перапрацоўваецца. Існуе звыш 300 унікальных тэхналогій па выкарыстанні адходаў.*

Каля 10 тысяч тон адходаў палімераў на год, у тым ліку моцна забруджаных, у краіне перапрацоўваюць на Барысаўскім заводзе пластмасавых вырабаў і прадпрыемстве «Белдругпалімер» у Гродне. На «Белдругпалімеры» завяршаецца мадэрнізацыя існуючых магутнасцяў з павелічэннем іх на 2000 тон, што дазволіць праводзіць аптычную сарціроўку адходаў палімераў, расказаў **Гадад ГАЛІМАЎ, намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства «Белрэсурсы»**:

*— Сёлета мы набылі комплекс па вытворчасці стрэйч-плёнкі і сталі рабіць імпартазамяшчальную прадукцыю. Паралельна на гэтым прадпрыемстве ствараюцца магутнасці для перапрацоўкі адходаў палімераў, каб рабіць там гранулят. А на «Гомельхімгандаль» працуе вытворчасць па перапрацоўцы адходаў шын (адна тысяча тон на год).*

Працягваецца сарціроўка на прадпрыемствах холдынга і 90 тысяч тон шклабою (усяго ў краіне летась утворана 411 тысяч тон адходаў шкла). З часам прадугледжана стварэнне новых магутнасцяў па сарціроўцы змяшанага шклабою, запатрабаванага за межамі краіны.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# Ад эканомікі паўторнага выкарыстання — да цыркулярнай

**Узровень паўторнага выкарыстання цвёрдых камунальных адходаў у нашай краіне складае 25 %, да 2035 года плануецца перапрацоўваць 90 % ЦКА. Што ўжо цяпер робіцца для развіцця эканомікі замкнёнага цыкла і якія праблемы трэба вырашыць, распавёў Анатоль ШАГУН, начальнік упраўлення дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».**




Калаж Віктара КАЛІНІНА.

### ЭКАНОМІКА БЫВАЕ РОЗНАЯ

Для нас дастаткова звыклая класічная лінейная мадэль эканомікі, якую можна апісаць так: зрабілі — выкарысталі — выкінулі.

Эканоміка замкнёнага цыкла, або цыркулярная, заснавана на аднаўленні рэсурсаў, перапрацоўцы другаснай сыравіны, пераходзе ад выкарыстання выкапнёвага паліва да аднаўляльных крыніц энергіі. За кошт такіх тэхналогій можна мінімізаваць здабычу рэсурсаў, утварэнне адходаў і іншых забрудджванняў навакольнага асяроддзя.

«Можна сказаць з пэўнымі дапушчэннямі, што ў Беларусі мадэль эканомікі набліжаецца да прамежкавага стану — да эканомікі паўторнага выкарыстання. Шэраг сектараў эканомікі ў значнай ступені існуе за кошт другасных сыравінных рэсурсаў: у металургічнай вытворчасці доля другаснай сыравіны дасягае практычна 100 %, у цэлюлозна-папяровай вытворчасці складае каля 90 %, у шклатарнай вытворчасці — больш за 50 %», — адзначыў Анатоль Шагун.

Між тым эканоміка замкнёнага цыкла — гэта не столькі нейкія фінансавыя паказчыкі, колькі іншая сістэма мыслення чалавека, яго спажывецкіх звычак, заснаваных на ўсведамленай неабходнасці больш рацыянальных вытворчасці і спажывання.

### КАМУНАЛЬНЫЯ АДХОДЫ Ў СІСТЭМЕ ЗАМКНЁНАЙ ЭКАНОМІКІ

У нашай краіне штогод утвараецца каля 4 млн тон ЦКА, што складае не больш за 6-7 % ад агульнага аб'ёму ўтварэння адходаў.

Цяпер выкарыстанне ЦКА ў асноўным абмяжоўваецца выманнем з іх складу другасных матэрыяльных рэсурсаў і перапрацоўкай некаторага аб'ёму арганічнай часткі. Пры цяперашнім складзе адходаў узровень выкарыстання ЦКА толькі за кошт другаснай сыравіны не можа перавышаць 30 %. Да таго ж развіццё вытворчасцяў па паглыбленай перапрацоўцы адходаў абыходзіцца значна даражэй, чым іх размяшчэнне на палігонах.

Нацыянальнай стратэгіяй па абыходжанні з ЦКА і ДМР прадугледжаны шэраг сістэмных прапаноў, накіраваных на зблізкэнне існуючай практыкі ў нашай краіне з найлепшымі сусветнымі дасягненнямі, якія паказалі сваю бяспечнасць і эфектыўнасць. У адпаведнасці са стратэгіяй, да 2035 года паказчык выкарыстання камунальных адходаў павінен дасягнуць 90 %. З гэтай мэтай плануецца выманне ўсіх прыдатных да выкарыстання другасных матэрыяльных рэсурсаў, што складаюць 29 % ад усяго аб'ёму ўтварэння ЦКА, і 61 % за кошт укаранення новых для Беларусі тэхналогій — кампаставання арганічнай часткі (23 %) і выкарыстання цеплатворнай фракцыі (38 %).

Камунальныя адходы, у першую чаргу адходы спажывання, могуць стаць надзейнай крыніцай сыравіны ў цыркулярнай эканоміцы, але для гэтага неабходна змяніць стратэгію як вытворцам тавараў, работ і паслуг, так і стратэгію паводзін спажыўцоў.

### УТВАРЭННЕ АДХОДАЎ ЛЕПШ ПРАДУХІЛІЦЬ

Прыярытэтам у сферы абыходжання з адходамі з'яўляецца мінімізацыя іх утварэння. Для гэтага ў сферы вытворчасці прадуктаў неабходна закандаўча замацаваць прынцыпы прадухілення ўтварэння адходаў і кіравання імі як рэсурсамі, што цяпер адсутнічае.

Для гэтага трэба будзе вырашыць шэраг задач як у сферы вытворчасці і дыстрыбуцыі, так і ў сферы спажывання.

Што трэба рабіць? Ствараць прадукт з доўгім тэрмінам службы, які падлягае рамонту, аднаўленню і паўторнаму выкарыстанню.

Пры выбары матэрыялаў арыентавацца на тыя, што выраблены з выкарыстаннем ДМР альбо для якіх маецца магчымасць іх шматразовай перапрацоўкі. Прынцыпам эканомікі замкнёнага цыкла адпавядае скарачэнне выкарыстання неаднаўляльных крыніц энергіі і ўтварэння адходаў пры вытворчасці прадукцыі і аказанні паслуг.

Пры арганізацыі збыту гатовых тавараў неабходна зніжаць аб'ёмы ўпакоўкі, выкарыстоўваць яе з матэрыялаў, якія могуць быць перапрацаванымі. З гэтай мэтай прапануецца ўвесці забарону на выкарыстанне асобных відаў упакоўкі і абмежаванне яе колькасці. Акрамя таго, неабходна распрацаваць меры, накіраваныя на зніжэнне страт пры рэалізацыі тавараў, у тым ліку звязаных з заканчэннем тэрміну іх прыдатнасці.

Мабыць, кожны спажывец сутыкаўся з тым, што вага ўпакоўкі можа ў некалькі разоў перавышаць вагу тавару. Таму ўяўляецца мэтазгодным распрацоўка нацыянальнага плана па ўпакоўцы і развіцці ўпаковачнай галіны ў прывязцы да задач эканомікі замкнёнага цыкла.

Усё гэта будзе мець эфект пры ўмове, што і паводзіны спажыўцоў зменяцца. Робіцца актуальнай прапаганда адказнага спажывання, папулярызуецца сумеснае выкарыстанне тавараў і паслуг, развіваецца сістэма паасобнага збору адходаў спажывання.

### ЯК ПАДОЎЖЫЦЬ ЖЫЦЦЁ ТАВАРАЎ?

Адзін з кірункаў цыркулярнай эканомікі — падаўжэнне жыццёвага цыкла тавараў шляхам стварэння сістэмы іх аднаўлення і шырокага выкарыстання шматабаротнай упакоўкі. Для вырашэння апошняй задачы аптымальным з'яўляецца ўкараненне дэпазітнай сістэмы абароту спажывецкай упакоўкі.

У галіне перапрацоўкі важна стварыць рынак другаснай перапрацоўкі шляхам фарміравання і падтрымання попыту і прапановы, а таксама ўмовы для энергетычнага выкарыстання адходаў. Гэта можа дасягацца як праз увядзенне забарон на размяшчэнне асобных відаў адходаў на палігонах, так і праз эканамічнае стымуляванне перапрацоўкі, павелічэнне падаткаў на размяшчэнне адходаў.

Анатоль Шагун нагадаў, што Мінпрыроды і Мінэканомікі распрацоўваюць Нацыянальны план дзеянняў па развіцці «зялёнай» эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь на 2021—2025 гады, у які ўключаны многія з пералічаных прапаноў, у тым ліку запланавана мерапрыемства па распрацоўцы і прыняцці стратэгіі развіцця эканомікі замкнёнага цыкла Беларусі на перыяд да 2035 года.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

У свеце жывёл

# Падарожжа ад Лагойска да румынскіх Карпат,

## або Як ратавалі медзведзяня

**Сумная гісторыя, што пачалася ў красавіку гэтага года, атрымала шчаслівы працяг. Дзякуючы ўзаемадзеянню прыродаахоўных і іншых арганізацый медзведзяня, што засталося без маці, атрымала шанц на вяртанне ў натуральнае асяроддзе.**

**Падрабязнасці раскрыла кансультант аддзела біялагічнай разнастайнасці галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Таццяна ЖАЛЯЗНОВА.**

### ЧАСОВЫ ПРЫТУЛАК У МІНСКІМ ЗААПАРКУ

Гісторыя медзведзяняці пачалася з шэрагу трагічных падзей: страта маці, а затым і сумны досвед зносін з людзьмі (пра гэта «Звязда» пісала ў нумары ад 25.05.2021). Калі маленькага мядзведзіка знайшлі, побач з ім слядоў маці не было. Мінскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя арганізаваў выезд камісіі па аказанні дапамогі дзікім жывёлінам, якая ўстанавіла, што медзведзяня знясіленае і мае патрэбу ў дапамозе. На жаль, прадстаўнікі гэтага віду могуць жыць самастойна толькі ва ўзросце ад двух гадоў, таму было прынята рашэнне аб адлове малога. Жывёліну перадалі ў Мінскі заапарк на часовае ўтрыманне.


minpriroda.gov.by

— Рашэнне пакінуць медзведзяня менавіта на часовае ўтрыманне было выклікана дзвюма прычынамі: у Мінскім заапарку няма ўмоў, якія б дазвалялі ўтрымліваць дарослага звера, — тлумачыць Таццяна Жалязнова. — Мядзведзь — гэта буйная жывёла, якой патрабуюцца пэўныя ўмовы ўтрымання. Другое — у нас была надзея на тое, што мы зможам даць яму шанц жыць у дзікім асяроддзі, а не ў клетцы. Таму Мінскім заапаркам сумесна з Мінпрыроды была арганізавана маштабная работа па пошуку рэабілітацыйных цэнтраў, якія пагадзіліся б прыняць нашага мядзведзіка на нейкі час, каб навучыць яго там і затым вярнуць у натуральнае асяроддзе ў Беларусі.

### ХТО ДАПАМОГ ЖЫВЁЛІНЕ?

На заклік аб дапамозе адгукнуўся рэабілітацыйны цэнтр для мядзведзяў-сірот Bear Again (Румынія). Дзякуючы фінансавай падтрымцы беларуска-германскага прадпрыемства «Санта Брэмар», дапамозе ад фонду абароны мядзведзяў World of Bears, праекта па выратаванні і абароне бурага мядзведзя ва Украіне і штодзённаму клопату супрацоўнікаў Мінскага заапарка 17 лістапада 2021 года медзведзяня было выпушчана ў дзікае асяроддзе на тэрыторыі рэабілітацыйнага цэнтра для мядзведзяў-сірот Bear Again для праходжання далейшай рэабілітацыі.

— Мы вельмі ўдзячныя за тую дапамогу, якую аказалі Bear Again, яны садзейнічалі з афармленнем усіх неабходных дакументаў, — адзначае Таццяна Жалязнова. — Паколькі мядзведзь трапляе пад дзеянне канвенцыі СІТЭС, і з нашага боку, і з боку Румыніі выконваліся ўсе патрабаванні па перамяшчэнні такога віду жывёл, што знаходзяцца на мяжы глабальнага знікнення.

Перш чым адправіць медзведзяня ў іншую краіну, трэба было вакцынаваць яго ад шаленства, набыць спецыяльныя ашыйнікі, каб затым можна было адсочваць яго месцазнаходжанне. Увесь гэты час яно знаходзілася ў Мінскім заапарку, дзе было ізалявана ад зносін з людзьмі, каб у яго не сфарміравалася прыхільнасць да чалавека — гэта было адно з патрабаванняў рэабілітацыйнага цэнтра.

— Хацелася б падзякаваць і «Санта Брэмар» за тую фінансавую дапамогу, якую яны аказалі, гэта вялікія выдаткі — клетка, транспарт, суправаджэнне. Адгукнуліся і нашы калегі з Украіны, якія арганізавалі зручны маршрут для медзведзяняці з мінімальнай колькасцю прыпынкаў, бо дзікай жывёліне складана знаходзіцца ў клетцы доўгі час. Атрымаўся міжнародны праект па выратаванні нашага мядзведзіка, — з усмешкай расказвае спецыяліст.

### НА РЭАБІЛІТАЦЫІ

Цяпер чырванакніжнік два гады будзе знаходзіцца ў рэабілітацыйным цэнтры. Гэта вялікая тэрыторыя, дзе выключана ўмяшанне чалавека. Мядзведзі там вучацца рабіць бярлогі, класціся ў спячку, знаходзіць ежу. Гэта праграма, накіраваная на тое, каб жывёліна самастойна адаптавалася да дзікага асяроддзя, магла выжыць без удзелу чалавека. Затым па заканчэнні курса яе вернуць у Беларусь і выпусцяць у раёне Бярэзінскага запаведніка. Туды, дзе ёсць усе неабходныя ўмовы для жыцця прадстаўнікоў віду.


Фота Дзяніса ІЎКОВІЧА.

— Работа была праведзена каласальная, — адзначае Таццяна Жалязнова. — Упершыню мы сутыкаліся з такімі цяжкасцямі, і вельмі рады, што ўсё добра вырашылася. Кіраўнік Bear Again доктар навук Леанарда Бярэжка прыняў наша медзведзяня, нягледзячы на тое, што ў лістападзе ўжо нікога не бяруць. Ён таксама прапанаваў пасля рэабілітацыі, пры магчымасці купіць спецыяльныя ашыйнік з GPS, працягнуць весці назіранне за жыццём звера ў лясах Беларусі. Да прыезду ў Мінскі заапарк медзведзяня было вельмі худзенькае, на мяжы знясілення, з праблемамі са здароўем. Былі нават думкі, што яно не выжыве. Але ў заапарку яго адкармілі, выхадзілі. Калі адпраўлялі ў рэабілітацыйны цэнтр, яно ўжо было падобнае да пампушкі! Як сказалі супрацоўнікі цэнтра, ён самы адкормлены сярод усіх мядзведзяў, якія там ёсць *(смяецца)*.

На працягу ўсёй дарогі ў рэабілітацыйны цэнтр медзведзяня харчавалася мёдам і вінаградам, а пад канец пачало злавацца — яму надакучыла быць у клетцы. У цэнтры цяпер знаходзяцца 13 мядзведзяў ва ўзросце да двух гадоў. Там не ўтрымліваюць жывёл у няволі пастаянна, іх рэабілітуюць і адпускаюць.

— Мы вельмі рады, што жывёла атрымала шанц жыць паўнавартасным жыццём, — кажа Таццяна Жалязнова. — У нас таксама ёсць рэабілітацыйныя цэнтры, напрыклад у Асіповічах, дзе займаюцца птушкамі, але з буйнымі жывёламі працаваць цяжэй, таму цэнтраў для іх у Беларусі пакуль няма. Але мы спадзяёмся, што з цягам часу, пры супрацоўніцтве з арганізацыямі, мы зможам стварыць нешта падобнае ў нашай краіне, каб дапамагаць жывёлінам.

**Ангеліна ВАРАТЫНСКАЯ.**

Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

# ПА АЗЁРАХ І ЛЯСАХ — У АДЗІН КЛІК

## ДЛЯ ЗАКАЗНІКАЎ «НАЛІБОЦКІ», «АЗЁРЫ» І «АСВЕЙСКІ» РАСПРАЦУЮЦЬ ВІРТУАЛЬНЫЯ ТУРЫ

**Гэтыя асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі абраныя пілотнымі дзякуючы рэалізацыі праекта «Развіццё экалагічнага турызму для садзейнічання «зялёнаму» пераходу да інклюзіўнага і ўстойлівага росту», які рэалізоўваецца ПРААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы траставага фонду «Расія-ПРААН у мэтах развіцця».**

На думку экспертаў праекта, заказнікі «Налібоцкі», «Азёры» і «Асвейскі» вызначаюцца вялікім экатурыстычным патэнцыялам, які пакуль максімальна не раскрыты. Інтэрактыўныя бясплатныя туры, што распрацоўваюцца для кожнага заказніка, будуць спрыяць прасоўванню ўнікальнага прыроднага патэнцыялу Беларусі. Дзякуючы ім людзі з розных куткоў планеты змогуць лепш пазнаёміцца з прыроднымі аб'ектамі нашай краіны і, магчыма, захочуць убачыць іх ужывую. Пашырэнне экатурызму на гэтых турыстычных прасторах, у сваю чаргу, дапаможа не толькі прыцягнуць дадатковую плынь як беларускіх, так і замежных турыстаў, але і ўмацаваць трансгранічнае супрацоўніцтва ў сферы развіцця прыродных тэрыторый, якія знаходзяцца пад асаблівай аховай. У перспектыве экатурызм прынясе эканамічныя выгады для заказнікаў, што дасць магчымасць інвеставаць прыбыткі ад турпрадуктаў у далейшае захаванне каштоўных раёнаў і паляпшэнне кіравання імі.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Віртуальны турызм стаў асабліва запатрабаваны ва ўмовах пандэміі каранавіруса, якая негатыўна адбілася на сферы турызму і падарожжаў па ўсім свеце. Сёння ён лічыцца адным са шляхоў аднаўлення турыстычнай галіны ў перыяд пост-COVID. Сучасныя тэхналогіі дапоўненай, віртуальнай і змяшанай рэальнасці могуць прапанаваць альтэрнатыўныя спосабы падарожнічаць па цікавых мясцінах, а таксама новыя мадэлі для галіны.

### ШТО ЎВОЙДЗЕ Ў ТУР?

Віртуальныя туры па трох заказніках ахопяць лясныя масівы і азёры, экалагічныя інклюзіўныя сцежкі, веламаршруты, турыстычныя стаянкі, мясціны пражывання дзікіх звяроў, уключаючы еўрапейскага зубра, а таксама такія славутасці, як 200-гадовая дуброва, рэшткі палаца Шадурскіх і іншыя. Каб перадаць выгляд гэтых аб'ектаў, на тэрыторыі пілотных заказнікаў з кастрычніка 2021-га да вясны 2022 года пройдуць аэра- і фотаздымкі.

На этапе збору фота і іншай інфармацыі пра пілотныя тэрыторыі прыцягненне валанцёраў не плануецца. Але ў далейшым у праекце будзе рэалізаваны кампанент па рабоце з экалагічнымі валанцёрамі. Над стварэннем віртуальных тураў будуць працаваць прафільныя арганізацыі, што займаюцца візуалізацыяй даных і спецыялізуюцца на стварэнні падобных тураў і даведнікаў. Цяпер праходзіць тэндар, па выніках якога будзе выбрана кампанія-распрацоўшчык. Пасля распрацоўкі віртуальныя туры па заказніках змесяцць на профільных турыстычных рэсурсах.

Інтэрфейсы віртуальных тураў будуць пададзены на трох мовах — беларускай, рускай і англійскай, а 3D- і аэрапанарамы будуць суправаджацца гукамі прыроды і музыкай. Туры адаптуюць для дэманстрацыі на ўсіх сучасных прыладах — стацыянарных камп'ютарах і ноўтбуках, смартфонах і планшэтах, а таксама ў акулярах і шлемах віртуальнай рэальнасці, на інтэрактыўных сталах і сэнсарных панэлях.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Праект «Развіццё экалагічнага турызму для садзейнічання «зялёнаму» пераходу да інклюзіўнага і ўстойлівага росту» скіраваны на ўмацаванне патэнцыялу і ўкараненне механізма рэалізацыі комплексу мер па развіцці і прасоўванні экатурызму; стварэнне патрэбнай метадычнай базы для развіцця экатурызму і сістэмы стратэгічнага планавання; умацаванне супрацоўніцтва паміж прыватнымі кампаніямі, дзяржаўнымі прыродаахоўнымі ўстановамі і мясцовым насельніцтвам. Разлічаны ён на тры гады.

Праект рэалізоўваецца Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы траставага фонду «Расія-ПРААН у мэтах развіцця».

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні намесніку галоўнага рэдактара часопіса «Родная прырода» Аксане Мікалаеўне Яноўскай у сувязі з горам, якое яе напаткала, — смерцю МАЦІ.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Трест Белсантехмонтаж № 1», г. Минск, ул. Я. Коласа, 23, к. 1** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование | Инв. № | Общ. пл., кв. м | Адрес | Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Складское помещение № 8Н (расположено в подвале) | 500/D-695622 | 36,5 | г. Минск, ул. Якуба Коласа, д. 23, корп. 1, пом. 8Н | 173 040,00 |
| | Складское помещение № 11Н | 500/D-70784559 | 43,5 | г. Минск, ул. Якуба Коласа, 23/1-11Н | |
| 2 | Складское помещение № 9Н (расположено в подвале). Обременение: аренда | 500/D-695623 | 59,5 | г. Минск, ул. Якуба Коласа, 23/1-9Н | 155 400,00 |
| 3 | Складское помещение № 7Н (расположено в подвале) | 500/D-695621 | 37,2 | г. Минск, ул. Якуба Коласа, д. 23, корп. 1, пом. 7Н | 92 400,00 |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственным участником электронных торгов, согласившимся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **10 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов **затраты** на их проведение и оплатить **вознаграждение** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 03.11.2021

Дата и время начала и окончания электронных торгов: **08.12.2021 с 11.00 до 13.00**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **06.12.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

# ОАО «Стройтрест № 7»

**извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 24 декабря 2021 г. внеочередного общего собрания по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 20 (зал заседаний)**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1) Об увеличении уставного фонда Общества за счет собственного капитала (части фонда переоценки) путем увеличения номинальной стоимости акции.

2) Внесение изменений в устав Общества и утверждение его новой редакции.

3) Внесение изменений в Положение о совете директоров Общества и утверждение его новой редакции. Утверждение Положения о ревизионной комиссии Общества.

4) Об избрании члена совета директоров Общества.

5) О досрочном прекращении полномочий действующего состава ревизионной комиссии Общества.

6) Об избрании членов ревизионной комиссии Общества.

Место проведения собрания – по месту нахождения ОАО «Стройтрест № 7»: г. Минск, пр-т Машерова, 20 (зал заседаний).

Начало работы собрания в 15.00.

Регистрация участников собрания – с 14.00 до 14.50 в день проведения собрания по месту его проведения. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 20 декабря 2020 г.

Орган, созывающий собрание: совет директоров Общества, основание созыва: протокол от 24.11.2021 № 12.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) каб. 212 с 14.00 до 17.00 начиная с 25.11.2021, по месту нахождения Общества.

***Совет директоров ОАО «Стройтрест № 7».***

УНП 100512859

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки». г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Управляющая компания «Гомельская мясо-молочная компания». 246029, г. Гомель, ул. Б. Лизюковых, 1** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: транспортное средство, бывшее в употреблении. Местонахождение: г. Гомель, ул. Б. Лизюковых, 1**

| Инв. № | Марка (модель), тип ТС, рег. знак, год выпуска |
|---|---|
| 00012 | **Автомобиль Volkswagen Passat Lim Highline**, легковой седан, рег. знак 1082 ВМ-3, 2008 г. в. |

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 12 120 бел. руб.**
**Шаг аукциона – 5 % от текущей цены**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минску), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **100 процентов** от цены продажи предмета торгов оплачивается в течение **5 (пяти)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи |

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **5 (пять) процентов** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

